Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 54 (5423)
НЯДЗЕЛЯ
8
САКАВІКА
1936 г.
Год выдання XIX

ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

РАБОТНІЦАМ, КАЛГАСНІЦАМ, УСІМ ПРАЦОЎНЫМ ЖАНЧЫНАМ ОРДЭНАНОСНАЙ СОВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ У МІЖНАРОДНЫ ЖАНОЧЫ КОМУНІСТЫЧНЫ ДЗЕНЬ ШЧЫРАЕ БОЛЬШЭВІЦКАЕ ПРЫВІТАННЕ!

МІЖНАРОДНЫ КОМУНІСТЫЧНЫ ЖАНОЧЫ ДЗЕНЬ

Сёння працоўныя жанчыны ўсяго свету святкуюць дваццаць шосты міжнародны комуністычны жаночы дзень.

З таго часу, як на адной шостай зямнага шара ўзвіўся чырвоны сцяг вызваленага пролетарыята, працоўныя жанчыны свету па-рознаму і ў неаднолькавых умовах адзначаюць гэта свята.

Там, у капіталістычных краінах, дзе пануе зверская эксплаатацыя чалавека чалавекам, працоўныя жанчыны знаходзяцца на становішчы рабынь. Жорсткі эканамічны крызіс у капіталістычных краінах асабліва рэзка адбіўся на становішчы працоўных жанчын. Нават на тых прадпрыемствах, дзе жанчыны яшчэ маюць магчымасць працаваць, за аднолькавую работу з мужчынамі яны атрымліваюць заработную плату ніжэй, чым мужчыны. Сярэдняя заработная плата жанчын у капіталістычных краінах не перавышае 40—50 проц. заработнай платы рабочых-мужчын.

З дня на дзень расце беспрацоўе. Па афіцыяльных даных, толькі ў адных Злучаных Штатах Амерыкі налічваецца звыш 2,5 млн. беспрацоўных жанчын, у Германіі — 1 млн. 800 тыс. і т. д. У капіталістычных краінах жанчына не карыстаецца ніякім дзяржаўным забеспячэннем на мацярынства.

Беспрацоўе, голад, жабрацтва, палітычнае бяспраўе — усе гэтыя «прелести» капіталістычнага ладу штурхаюць працоўных жанчын на прастытуцыю. У адной толькі Варшаве ў 1925 г., па афіцыяльных даных, лічылася 2.831 зарэгістраваных прастытутак і 6.000 незарэгістраваных. У Італіі, па афіцыяльных даных фашысцкай прэсы, лічыцца 11.924 зарэгістраваных прастытутак. У Японіі афіцыяльна зарэгістраваных прастытутак лічыцца 50.353. У фашысцкай Германіі прастытуцыя стала, як сцвярджае англійскі журнал «Медыкел рэкорд», адным з прыбытковых артыкулаў начальнікаў штурмавых атрадаў. Гітлераўскія агітпропы — Гебельсы і Герынгі — сцвярджаюць, што не можа быць роўнапраўя паміж жанчынай і мужчынай.

Капіталізм мне і душыць таленты працоўных жанчын.

Але ўсё больш і больш расце рэвалюцыйнае бражэнне, усё больш і больш працоўныя жанчыны згуртоўваюцца пад сцягамі Комуністычнага Інтэрнацыянала.

На вуліцах Мадрыда, у горах Астурыі, на барыкадах Вены, у кітайскай Чырвонай арміі жанчыны са зброяй у руках змагаліся і змагаюцца супроць дыктатуры буржуазіі.

Працоўныя жанчыны — адзіная частка рабочага класа. Няма ў іх іншых інтарэсаў апрача вызвалення рабочага класа і сялянства ад гнёту памешчыкаў і буржуазіі.

Германскі, італьянскі і польскі фашызм і буржуазныя ўлады іншых капіталістычных краін, імкнучыся затрымаць растучы рэвалюцыйны ўздым сярод усяго рабочага класа, кідаюць у турмы, на вісельні лепшых сыноў і дачок пролетарыята.

Але нішто не можа затрымаць ідэалы рабочага класа — ідэалы комунізма. Хіба можна затрымаць ідэі марксізма! Ідэя штурму спее ў свядомасці мас. Пад вялікімі непераможнымі сцягамі Маркса—Энгельса — Леніна — Сталіна працоўныя жанчыны разам з усім рабочым класам змагаюцца за ўстанаўленне дыктатуры пролетарыята, за сусветную пролетарскую рэвалюцыю.

Там, у капіталістычных краінах, міжнародны комуністычны жаночы дзень працоўныя жанчыны будуць святкаваць у надзвычай цяжкіх умовах фашысцкай дыктатуры.

У нас, у Совецкім Саюзе, з таго часу як перамагла Вялікая Кастрычніцкая рэвалюцыя, працоўныя жанчыны святкуюць гэты дзень як усенароднае свята. «Совецкай уладай, як уладай працоўных, у першыя-ж месяцы яе існавання, быў зроблен у заканадаўстве, датычным жанчыны, самы рашучы пераварот. З тых законаў, якія ставілі жанчыну ў становішча падпарадкаванай, у Совецкай рэспубліцы не засталося каменя на камені». **(Ленін).**

Совецкая ўлада шырока адкрыла дарогу для творчай работы працоўных жанчын. Няма такой кваліфікацыі, няма такой галіны гаспадаркі, дзе не была-б занята працоўная жанчына. Урачы і педагогі, мораплаваццелі і лётчыкі, дзяржаўныя дзеячы і дзеячы навукі, стаханаўцы на вытворчасці і ў сельскай гаспадарцы,—скрозь і ўсюды працоўныя жанчыны з'яўляюцца поўнапраўнымі працаўнікамі вялікай соцыялістычнай будоўлі.

На фабрыках і заводах, у калгасах і соўгасах, — скрозь і ўсюды ведаюць выдатных новых людзей сталінскай эпохі. Толькі вялікі **Сталін**, толькі вялікая партыя большэвікоў маглі ўзняць з нетраў народу багацейшыя таленты. Імёны **Марыі Дземчэнка, Вінаградавых, Фёдаравай** вядомы не толькі ў СССР, але і далёка за яго межамі, побач з іменамі буйных вучоных, работнікаў мастацтваў і т. д.

Магутны размах стаханаўскага руху — гэтай вышэйшай формы соцыялістычнага спаборніцтва — шырока захапіў працоўных жанчын. На прадпрыемствах Беларусі шырока вядомы імёны работніцы **Анны Афанасьеўны Лёвачкінай**, члена ЦВК Саюза, лепшай стаханаўкі, работніц-стаханавак **Ніны Сарбай, Дабравольскай, Якушавай, Мясаедавай, Лосевай**, — людзей, якія заваявалі сабе славу.

Нядаўна партыя і ўрад далі вышэйшую ўзнагароду гераіням стаханаўкам сельскай гаспадаркі Беларусі. Тт. **Башкірава Ефрасіння Сільвестраўна, Каўдзерка Марыя Францаўна, Канстанцінава Анна Андрэеўна** ўзнагароджаны ордэнам Леніна. **Ляшчыліна Анна Цімафееўна, Белая Елізавета Васільеўна, Селязнёва Васіліса Ермалаеўна** — ордэнам Працоўнага чырвонага сцяга. Побач з імі цэлы рад калгасніц-стаханавак узнагароджаны ордэнам «Знак пачета».

«Толькі калгаснае жыццё магло зрабіць працу справай гонару, толькі яно магло парадзіць сапраўдных гераінь-жанчын на вёсцы. Толькі калгаснае жыццё магло знішчыць няроўнасць і паставіць жанчыну на ногі. Гэта вы самі добра ведаеце. Калгас увёў працадзень. А што такое працадзень? Перад працаднём усе роўныя — і мужчыны, і жанчыны. Хто больш працадзён выпрацаваў, той больш і зарабіў. Тут ужо ні бацька, ні муж дакараць жанчыну не можа, што ён яе корміць. Цяпер жанчына, калі яна працуе і ў яе ёсць працадні, яна сама сабе гаспадыня». **(Сталін).**

Толькі пры совецкай уладзе, толькі ў калгасах жанчыны маглі атрымаць пры выключным падтрыманні і клопатах большэвіцкай партыі і вялікага **Сталіна** свабоднае, заможнае, вясёлае і радаснае жыццё. Таму і з'явіліся ў калгасах самаадданая работа жанчын, выдатныя прыклады працоўнага гераізму, выдатныя арганізатары, якія авалодваюць тэхнікай справы. Таму і берагуць цяпер жанчыны калгасніцы калгасны лад, які вызваліў жанчыну ад векавога гнёту і падняволення, берагуць, як зяніцу вока.

Партыйныя і совецкія арганізацыі павінны яшчэ мацней разгарнуць работу сярод працоўных жанчын з тым, каб мабілізаваць актыўнасць працоўных жанчын на далейшае паляпшэнне работы, на выкананне і перавыкананне планаў другой пяцігодкі.

Трэба рашуча і беспаваротна пакончыць з фактамі недаацэнкі значэння жанчыны ў калгасе, на прадпрыемстве, якія яшчэ ёсць сярод асобных кіраўнікоў. «Жанчына ў калгасах — вялікая сіла. Трымаць гэту сілу пад спудам значыць дапусціць злачынства. Наш абавязак заключаецца ў тым, каб высоўваць жанчын у калгасах і пусціць гэту сілу ў справу». Так вучыць нас вялікі **Сталін.**

ЦК КП(б)Б адзначыў зусім нездавальняючую работу па вылучэнню жанчын на кіруючыя работы ў калгасах, сельсоветах і т. д. у Дзяржынскім і Церахаўскім раёнах. ЦК моцна звярнуў увагу на недапушчальнасць падобных фактаў.

Урокі Дзяржынскага і Церахаўскага раёнаў павінны ўлічыць усе раённыя партыйныя і совецкія арганізацыі.

Правядзем міжнародны комуністычны жаночы дзень — 8 сакавіка як усенароднае свята.

Мабілізуем актыўнасць працоўных жанчын на далейшую работу па выкананню і перавыкананню планаў другой пяцігодкі.

Акружым асаблівай увагай і гонарам жанчын — гераінь, выдатніц, стаханавак прамысловасці, транспарту, сельскай гаспадаркі і абароннай работы.

Гарачае большэвіцкае прывітанне працоўным жанчынам — барацьбітам за пабудову бескласавага соцыялістычнага грамадства.

Няхай жыве міжнародны комуністычны жаночы дзень — 8 сакавіка!

Няхай жыве наша большэвіцкая партыя і яе правадыр, друг і настаўнік народаў СССР вялікі СТАЛІН!

У СОЎНАРКОМЕ САЮЗА ССР І ЦК ВКП(б)

Аб школьным будаўніцтве ў 1936 годзе

Разгледзеўшы пытанне аб школьным будаўніцтве, Совет Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) адзначылі паспяховае выкананне плана школьнага будаўніцтва ў 1935 годзе.

Пабудавана і ўведзена ў эксплаатацыю 533 школы (у тым ліку 350 сярэдніх школ) на 286 тысяч вучнёўскіх месц у гарадах і рабочых пасёлках і 2.829 школ на 513 тыс. вучнёўскіх месц у сельскіх мясцовасцях (акрамя расшырэння існуючых школ на 250 тыс. вучнёўскіх месц.).

Разам з тым Совет Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) адзначылі, як буйнейшыя недахопы, значнае перавышэнне планавага кошту школьнага будаўніцтва ў большасці гарадоў і слабое кіраўніцтва будаўніцтвам школ з боку органаў народнай асветы, у асаблівасці ў сельскіх мясцовасцях.

У мэтах далейшай ліквідацыі зменнасці і размяшчэння ўноў паступаючых у школы вучняў, СНК Саюза ССР і ЦК ВКП(б) пастанавілі:

1. У адпаведнасці з зацверджанымі цітульнымі спіскамі школьнага будаўніцтва ўстанавіць аб'ём будаўніцтва ў гарадах і рабочых пасёлках СССР у 1936 годзе ў 1.507 школ на 890.530 вучнёўскіх месц, коштам у 844 мільёны 435 тыс. рублёў (уключаючы пераходнае будаўніцтва, абсталяванне і будаўніцтва інтэрнатаў для навучаючыхся) *).

Па БССР павінна быць пабудавана 37 школ на 18.440 вучнёўскіх месц і аб'ём укладанняў у 1936 годзе складае 16 мільёнаў 707 тыс. рублёў; у тым ліку ў г. Менску павінна быць пабудавана 6 школ на 4.800 вучнёўскіх месц, коштам у 4 мільёна 448 тыс. рублёў.

2. Будаўніцтва школ у гарадах у 1936 годзе праводзіць па тыпах школьных будынкаў, зацверджаных на 1935 год. Забараніць новае будаўніцтва нетыповых школ. Прадугледзець павелічэнне ўстаноўленай на 1935 год кубатуры школ з цэнтральным ацяпленнем для будаўніцтва кацельных.

3. З усёй сумы гадавых асігнаванняў на школьнае будаўніцтва 1936 года адпусціць у першым квартале 1936 г. 30 проц. гадавых асігнаванняў, у другім квартале 1936 г. — 40 проц. і астатнія сумы, за вылікам выдатага авансу ў 30 млн. рублёў, у трэцім квартале г. г.

Пацвердзіць, што сродкі, асігнаваныя на школьнае будаўніцтва па мясцоваму бюджэту і за кошт гаспадарчых органаў, павінны выдзяляцца як мэтавы фонд, і не могуць быць выкарыстаны на іншыя патрэбы.

4. Дзяржплану СССР выдзеліць у гадавых і квартальных планах фонды снабжэння будаўнічымі матэрыяламі і абсталяваннем, забяспечваючыя гэту праграму гарадскога школьнага будаўніцтва.

5. Абавязаць горсоветы ўзмацніць загатоўку будаўнічых матэрыялаў, асабліва мясцовых будматэрыялаў, для будуючыхся школ з тым, каб да канца першага квартала 1936 г. асноўная маса будаўнічых матэрыялаў была загатоўлена і падвезена да будаўнічых пляцовак.

6. Абавязаць наркаматы мясцовай прамысловасці па ўзгадненню з наркомасветамі саюзных рэспублік і гарадскія советы арганізаваць вытворчасць і забяспечыць да 1 жніўня 1936 года поўнае стандартнае абсталяванне школ мэбляй (парты, шафы, школьныя дошкі, сталы і інш.).

7. Вызначыць размеры школьнага будаўніцтва ў сельскіх мясцовасцях у 1936 г. у 2.802 школы на 568.865 вучнёўскіх месц, коштам у 247 мільёнаў 680 тыс. рублёў, уключаючы будаўніцтва інтэрнатаў.

8. Абавязаць СНК саюзных рэспублік, краявыя, абласныя выканаўчыя камітэты і горсоветы, а таксама органы народнай асветы забяспечыць сканчэнне будаўніцтва школ па плану 1936 г. да 10 жніўня, а прыёмку іх і абсталяванне — да 20 жніўня 1936 года.

ЦК ВКП(б) і СНК СССР абавязалі ўсе партыйныя, совецкія і гаспадарчыя арганізацыі забяспечыць безумоўнае і своечасовае выкананне ўказанай вышэй праграмы, звярнуўшы асаблівую ўвагу на якасць школьнага будаўніцтва.

---

*) У «Праўде» змешчана табліца з разбіўкай па рэспубліках, краях і абласцях. З гэтай табліцы ўзяты лічбы, якія датычаць БССР.

---

8 сакавіка 1936 года ў зале Дома ўрада адбудзецца ўрачысты сход, прысвечаны міжнароднаму комуністычнаму жаночаму дню — 8 сакавіка.

Пачатак роўна ў 6 гадзін вечара.

Члены і кандыдаты ЦК КП(б)Б і ўрада, члены Менгаркома і горрайкомаў КП(б)Б, члены прэзідыума горсовета і РВК, упаўнаважаныя КПК і КСК, члены прэзідыума ЦСПСБ, члены бюро ЦК, ГК і горрайкомаў ЛКСМБ праходзяць па сваіх мандатах.

Запрашальныя білеты — у горрайкомах КП(б)Б.

ОРГКАМІСІЯ.

Працоўныя Менска з вялікім уздымам вывучаюць гутарку таварыша СТАЛІНА

ЗАВОД ІМЯ ВАРАШЫЛАВА

ВЫХАВАЕМ МЕТКІХ СНАЙПЕРАЎ

...У многіх рабочых былі свае газеты. Яны з неаслабнай увагай сачылі за чыткай гутаркі таварыша **Сталіна** з старшынёй амерыканскага газетнага аб'яднання.

Ясныя сталінскія адказы на запытанні містэра Говарда не раз перарываліся бурнымі воклічамі ў гонар таварыша **Сталіна.**

Скончылася чытка ў механазборачным цэху. Слова ўзяў слесар стаханавец тав. **Ваўчок.** Ён гаварыў аб той частцы гутаркі, дзе ідзе размова аб абароне нашых далёка-ўсходніх граніц.

— Калі патрэбуецца, мы ўсе як адзін пойдзем на абарону соцыялістычнай краіны, на дапамогу прыязнай нам Мангольскай Народнай Рэспублікі.

Стары рабочы прафорг кацельнага цэха т. **Пагожын**, парторг загатоўчага цэха т. **Дубровіцкі** і дзесяткі іншых стаханаўцаў простымі словамі выказалі сваю адданасць і бязмежную любоў правадыру народаў таварышу **Сталіну.**

— Прамова таварыша Сталіна— заявілі варашылаўцы — надае нам новую энергію, натхняе нас на выдатныя паказальнікі ў стаханаўскім двухдэкадніку, на ўзмацненне абароннай работы.

Выхаваем без адрыву ад вытворчасці дзесяткі лётчыкаў, парашутыстаў, меткіх снайпераў, якія гатовы разіць ворага і на Захадзе, і на Ўсходзе.

Чытка гутаркі прадоўжыцца і сёння.

ФАБРЫКА ІМЯ КРУПСКАЙ

ВЫЧАРПАЛЬНЫ АДКАЗ

У абедзены перапынак цахавыя агітатары **швэйнай фабрыкі імя Крупскай** сабралі свае групы. Сёння — хвалюючая, цікавячая ўсіх тэма: гутарка таварыша **Сталіна** з старшынёй амерыканскага газетнага аб'яднання п. Рой Говардам.

Цэх № 3. Многія рабочыя яшчэ пазаўчора чыталі ў газетах гэту гутарку. Але цяпер яны разам з усімі рабочымі з аднолькавым захапленнем слухаюць агітатараў, якія чытаюць і растлумачваюць кожнае пытанне Говарда і адказы таварыша Сталіна.

Агітатараў часта перарываюць рэплікі рабочых:

— Вось гэта ясна, сапраўды па-сталінску!

— Выдатна!

— Вычарпальны адказ!

Захапленне рабочых часта выліваецца ў радасныя прывітальныя воклічы ў гонар таварыша **Сталіна.**

Прапрацоўка гутаркі таварыша **Сталіна** з п. Говардам яшчэ не скончана. Дайшлі да совецка-амерыканскіх адносін. Сёння працяг гутаркі.

АБУТКОВАЯ ФАБРЫКА ІМЯ КАГАНОВІЧА

ГЛЫБОКАЯ ЛЮБОЎ ДА ВЯЛІКАГА ПРАВАДЫРА

Ва ўсіх цэхах, зменах і брыгадах з велізарным інтарэсам чыталі і абмяркоўвалі гутарку таварыша Сталіна з старшынёй амерыканскага газетнага аб'яднання.

Мудрыя і выразныя вызначэнні і адказы, даныя таварышам Сталіным, выклікалі захапленне і аднадушнае адабрэнне рабочых. Ініцыятар стаханаўскага руху ў БССР тав. **Скабло** (першы пашывачны цэх) параўнаў ясныя адказы таварыша Сталіна з яго праграмнай прамовай на ўсесаюзнай нарадзе стаханаўцаў.

— Як у прамове на нарадзе стаханаўцаў, — заявіў тав. Скабло, — таварыш Сталін з надзвычайнай яснасцю вызначыў карэнні і шляхі развіцця стаханаўскага руху, так і ў яго адказах Говарду таварыш Сталін ясна і выразна ўсяму свету заявіў **аб нашай палітыцы.**

Стаханавец **Фельдман** (першы пашывачны цэх) сваё выступленне прысвяціў адказу **таварыша** Сталіна адносна дапамогі Мангольскай Народнай Рэспубліцы ў выпадку нападу на яе **Японіі.**

— Мы павінны, — заявіў тав. Фельдман, — узняць нашу абаронную работу, бо таварыш Сталін ясна ўказаў на ачагі вайны.

Стаханаўцы закройнага цэха **Каждан** і **Райхлін**, парусінавага цэха **Шулькін** і інш. выступаўшыя з пачуццём глыбокай любві да правадыра працоўных, гаварылі аб значэнні гэтай гутаркі для справы міру, для росту магутнасці нашай соцыялістычнай радзімы.

Гутарка таварыша Сталіна таксама абмяркоўвалася на партыйным актыве фабрыкі.

ФАБРЫКА «КОМУНАРКА»

Яшчэ больш мацаваць магутнасць краіны!

Абедзены перапынак. Ва ўсіх цэхах фабрыкі ідзе чытка гутаркі таварыша Сталіна з п. Роем Говардам. Уважліва слухаюць сотні рабочых.

У мяккашакаладным цэху чытку праводзіць агітатар **Дзятковіч.**

Прастата і чоткасць выказванняў правадыра робяць іх даступнымі шырокім масам працоўных.

Работніца **Войсфельд**, як-бы рэзюміруючы ўражанні ад гутаркі, заявіла: «У гутарцы правадыра, у яснасці яго адказаў адчуваецца магутнасць нашай краіны. Трэба кожнаму з нас яшчэ больш мацаваць яе. Для гэтага будзем лепш працаваць і ўздымаць прадукцыйнасць працы».

Гутарка правадыра выклікала велізарны ўздым сярод рабочых.

Водгукі сусветнага друку на гутарку тав. Сталіна з п. Рой Говардам

ЗША

«НІКОЛІ НЕ БЫЛО БОЛЬШ ПРАМОЙ ГУТАРКІ»

НЬЮ-ЁРК, 6 сакавіка. (БЕЛТА). «Уорлд тэлеграм» і іншыя газеты аб'яднання Скрыппс-Говард апублікавалі перадавы артыкул, прысвечаны гутарцы тав. Сталіна з Говардам. У артыкуле, між іншым, гаворыцца:

«Сталін гутарыць пра ваенную небяспеку. З двух ачагоў выходзіць небяспека — з японскай зоны і з германскай зоны. Ніколі яшчэ не было больш прамой і больш характэрнай гутаркі. Яна вялася без той блытанай, асцярожнай мовы, якая звычайна так часта ў такіх выпадках прыкрывае сапраўдныя думкі. Падрабязна абмеркаваны былі пытанні аб вайне і міру, аб Японіі і Гітлеру, аб капіталізме, аб комунізме і соцыялізме, аб совецка-амерыканскіх адносінах — аб усім гэтым Сталін ясна выказаўся».

Аўтар артыкула ўказвае, што заявы Сталіна, — гэта заявы «найвышэйшага аўтарытэта народу, які налічвае больш 170 млн. чалавек, народу моцнага ў ваенных адносінах і імкліва павялічваючага сваю магутнасць».

Англія

ПАПЯРЭДЖАННЕ ЎСЯМУ СВЕТУ

ЛОНДАН, 6 сакавіка (БЕЛТА). Штотыднёвік «Эканаміст», каментуючы гутарку тав. Сталіна з Говардам, піша, што зроблены Сталіным напамінак аб 1921 годзе, калі совецкія войскі выцяснілі рускіх белагвардзейцаў і іх японскіх патронаў з Манголіі, «можа з'явіцца благатворным пры цяперашнім сцячэнні акалічнасцей». Далей «Эканаміст» указвае, што гэта папярэджанне, зробленае з боку СССР, прадстаўляе сабой больш, чым выражэнне традыцыйнай заклапочанасці СССР як-бы ён раптоўна не аказаўся абложаным на заходняй і ўсходняй граніцах».

«Гэта папярэджанне Еўропе і ўсяму свету з боку члена Совета Лігі нацый аб тым, што, што-б ні здарылася ў Абісініі, пролетарская Расія гатова абараняць цэласнасць сваіх граніц». Аўтар артыкула ўказвае, што СССР не вядзе палітыкі агрэсіі. «Папярэджанне, зробленае Сталіным, — заключае аўтар артыкула, — павінна прыцягнуць да сябе ўвагу як у Еўропе, так і ў Азіі. Яно ясна гаворыць, што **агрэсія супроць совецкай тэрыторыі азначае вайну».**

Чэхаславакія

НАПАД НА СССР—НАПАД НА ЎСЕАГУЛЬНЫ МІР

ПРАГА, 6 сакавіка. (БЕЛТА. Усе газеты друкуюць у падрабязным пераказе гутарку тав. Сталіна з Говардам. Газеты выказваюць задавальненне цвёрдасцю і яснасцю палітыкі Совецкага Саюза, якая знайшла такое яркае выражэнне ў словах тав. Сталіна. Орган прамысловых колаў «Багемія» ў перадавым артыкуле падкрэслівае, што «можа быць цяпер, калі СССР вуснамі Сталіна не двусэнсна заявіў, што пры ўсякім замаху на Знешнюю Манголію (МНР), Японія будзе мець справу з Чырвонай арміяй у Токіо атрымаюць верх больш разумныя і асцярожныя элементы».

Цяпер ясна, — гаворыць далей газета, — «што напад на Манголію быў-бы нападам на СССР, а напад на СССР — нападам на ўсеагульны мір, чым быў-бы запален факел новай сусветнай вайны».

Германія

ЗВЫЧАЙНЫЯ АНТЫСОВЕЦКІЯ ВЫПАДЫ

БЕРЛІН, 6 сакавіка. (БЕЛТА). Германскі друк па-ранейшаму ўпарта замоўчвае гутарку тав. Сталіна з Говардам. Газетам да гэтага часу забараняецца друкаваць нават кароткі змест гутаркі. Толькі «Фелькішэр беабахтэр», спасылаючыся на гутарку, сёння выступае з артыкулам, напоўненым звычайнымі для гэтай газеты антысовецкімі выпадамі.

Польшча

ЗАМОЎЧВАЮЦЬ ЗМЕСТ ГУТАРКІ

ВАРШАВА, 6 сакавіка. (БЕЛТА) Польскія газеты сёння паведамляюць аб гутарцы тав. Сталіна з Говардам, змяшчаючы тэлеграмы сваіх замежных карэспандэнтаў, якія адзначаюць толькі абзацы, што характарызуюць становішча на Далёкім Усходзе.

Больш падрабязнае паведамленне аб гутарцы тав. Сталіна дае венскі карэспандэнт газеты «Кур'ер подзенны», які адзначае словы тав. Сталіна аб тым, што калі якая небудзь дзяржава хоча ваяваць з другой дзяржавай, нават не суседняй, то яна пачынае шукаць граніцы, праз якія яна магла-б дабрацца да граніцы дзяржавы, на якую яна хоча напасці.

УДЗЕЛЬНІКІ ЛЫЖНА-МАТАЦЫКЛЕТНАГА ПРАБЕГУ ЛЕНІНГРАД—МЕНСК—ЛЕНІНГРАД НА ПРЫЁМЕ У ТТ. С. М. БУДЗЁННАГА І Н. М. ГАЛАДЗЕДА

Учора ў СНК БССР маршал Совецкага Саюза **Семён Міхайлавіч Будзённы** і старшыня СНК БССР тав. **Н. М. Галадзед** прынялі ўдзельнікаў лыжна-матацыклетнага прабегу Ленінград—Менск—Ленінград.

Камандор прабегу інжынер III ранга т. Гаркун азнаёміў тт. С. М. Будзённага і Н. М. Галадзеда з папярэднімі вынікамі прабегу. Тав. Гаркун — ураджэнец БССР, бацька яго — калгаснік Дзяржынскага раёна. У Чырвонай арміі ён атрымаў вышэйшую тэхнічную асвету. Выступалі таксама памочнік камандора т. Лунёў, парторг прабегу т. Васільеў і лыжнік Маржэцкі — стаханаўцы баявой падрыхтоўкі.

Удзельнікі прабегу прасілі тав. Будзённага перадаць ад імя байцоў і камандзіраў Ленінградскай ваеннай акругі баявое чырвонаармейскае прывітанне **арганізатару** Чырвонай арміі, правадыру **народаў** таварышу **Сталіну**, правадыру Чырвонай арміі наркому таварышу **Варашылаву.**

Тав. Галадзед удзельнікі прабегу прасілі перадаць прывітанне ўраду і працоўным БССР.

Маршал Совецкага Саюза С. М. Будзённы вітаў удзельнікаў прабегу ад імя Чырвонай конніцы і ўсёй Чырвонай арміі і адзначыў велізарнае значэнне прабегу. Семён Міхайлавіч пажадаў камандзірам і чырвонаармейцам паспяхова закончыць прабег. Тав. Галадзед, вітаючы ўдзельнікаў прабегу, падкрэсліў, што БССР можа ганарыцца тым, што адзін з яе сыноў т. Гаркун з'яўляецца стаханаўцам баявой падрыхтоўкі і камандорам прабегу.

Пасля прыёму ўдзельнікі прабегу сфатаграфаваліся з тт. С. М. Будзённым і Н. М. Галадзедам.

ЛЕПШЫЯ ІЛЬНАВОДЫ БССР ВЫЕХАЛІ Ў МАСКВУ

Учора ў Маскву выехала дэлегацыя лепшых ільнаводаў Совецкай Беларусі: старшыні перадавых па ільну калгасаў, стаханаўкі-ільнотрапальшчыцы, дырэктары ільнозаводаў і інш. Сярод іх знатная трапальшчыца БССР Сцепаніда Быкоўская з калгаса імя Чарвякова, Лёзнянскага раёна, і Антаніна Кірмашук—стаханаўка-трапальшчыца калгаса «Звязда», Заслаўскага раёна. Усяго ў складзе дэлегацыі 21 чалавек.

МАРШАЛ СОВЕЦКАГА САЮЗА ТАВ. БУДЗЁННЫ ВЫЕХАЎ У МАСКВУ

7 сакавіка ўвечары кур'ерскім поездам выехаў у Маскву маршал Совецкага Саюза тав. Будзённы. На менскім вакзале тав. Будзённага праводзілі старшыня ЦВК БССР тав. Чарвякоў, старшыня СНК БССР тав. Галадзед і загадчык аддзела партыйнай прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б тав. Конік. Пад гукі маршу «Будзённага» поезд крануўся з месца. (БЕЛТА).

◆

У АПОШНЮЮ МІНУТУ

ПРАВАЛ ФАШЫСЦКАГА ПЕРАВАРОТУ У ГРЭЦЫІ

АФІНЫ, 7 сакавіка. (БЕЛТА). Усе газеты прыводзяць падрабязнасці правалу спробы ўстанавіць адкрытую ваенна-фашысцкую дыктатуру ў Грэцыі, спробы, зробленай 6 сакавіка часткай «ваеннай лігі» на чале з генераламі Папагосам (ваенны міністр) і Платысам (таварыш ваеннага міністра). Папагос днём 6 сакавіка прад'явіў каралю ад імя вышэйшага афіцэрства патрабаванні аб неадкладным роспуску парламента, аб прыпыненні дзеяння канстытуцыі, аб забароне палітычных партый, аб арышце рэспубліканскіх лідэраў і комуністычных дэпутатаў. Папагос трэбаваў таксама стварэння ўрада з генералаў на чале з ім (Папагосам) і ачышчэння арміі, а таксама дзяржаўнага апарата ад «ненадзейных элементаў». Аднак, супроць Папагоса выступілі камандуючы флотам адмірал Саккеларыюс, які вывеў к гэтаму часу ў адкрытае мора дывізіён мінаносцаў і падрыхтаваўся да абстрэлу горада, і камандуючы першым корпусам генерал Пітсікас, які заняў часцямі афінскай дывізіі важнейшыя пункты горада. Камандаванне першага корпуса і камандаванне флота, да якіх далучылася таксама група вышэйшага генералітэта, заявілі аб вернасці каралю.

У адказ на прад'яўленне патрабавання кароль зволіў у адстаўку Папагоса і Платыса, назначыўшы Метаксаса ваенным міністрам. Арыштавана 15 афіцэраў, прыхільнікаў Папагоса.

Згодна паведамлення ўрада, камандзіры правінцыяльных карпусоў і гарнізонаў заявілі аб падначаленні ўраду.

Комуністычная газета «Рызоспастыс», у сувязі са спробай фашысцкага перавароту, указвае, што манархія і ўрад вымушаны былі ўдаліць Папагоса і Платыса ў рэзультаце росту народнага абурэння. Правал фашысцкага перавароту, — заяўляе газета, — з'яўляецца несумненнай перамогай народу. Аднак, назначэнне на пост ваеннага міністра фашыста гітлераўскага тыпу Метаксаса прадстаўляе сабою новы выклік працоўным з боку фашызма.

Усебеларуская нарада перадавікоў соцыялістычнай жывёлагадоўлі

РАНІШНЯЕ ПАСЯДЖЭННЕ 6 САКАВІКА

На трыбуну зала з'ездаў Дома Ўрада падымаліся даяркі, свінаркі, конюхі, цялятніцы, аўчары — лепшыя майстры соцыялістычнай жывёлагадоўлі Совецкай Беларусі.

Людзі сталінскай зарадкі, загартаванасці — ордэнаносцы перадаюць свой багаты вопыт стаханаўскай работы. На трыбуне старшыня калгаса **«Калінінск»**, Уздзенскага раёна, т. **Самахвалаў В. І.**, узнагароджаны ордэнам Леніна. Ён гаворыць аб людзях, аб кадрах, выхаваных партыяй, вялікім **Сталіным.** Калектыўная праца перарадзіла гэтых людзей, зрабіла актыўнымі барацьбітамі за калгасную справу — стаханаўцамі жывёлагадоўлі.

Уважліва слухаюць дэлегаты выступленне маладога свінара — 17-гадовага комсамольца **Рамана Рачыцкага.** Ён брыгадзір матачнай брыгады соўгаса імя **Варашылава,** Бялыніцкага раёна. Раман Рачыцкі ў 1934 годзе скончыў курсы брыгадзіраў. Праз год ён аўладаў тэхнікай свінагадоўлі. Летась яго брыгада атрымала ад кожнай свінаматкі па 22 штукі дзелавых парасят і 72 пуды мяса. Такіх свіней у яго брыгадзе 40 талоў.

— Сёлета я даб'юся ад сваіх свінаматак па 25 штук дзелавых парасят і па 80 пудоў мяса. Выклікаю на соцспаборніцтва ордэнаноску **Васілісу Селязнёву** — загадчыцу фермы калгаса **«Беларуская вёска»**, Лёзнянскага раёна,— гаворыць Раман Рачыцкі.

У сярэдзіне пасяджэння ў зале паяўляецца маршал Совецкага Саюза **Семён Міхайлавіч Будзённы,** які пад гучныя апладысменты дэлегатаў займае месца ў прэзідыуме. Дэлегаты ўстаюць і наладжваюць авацыю ў гонар непераможнай слаўнай Чырвонай арміі.

— Няхай жыве наша вялікая соцыялістычная радзіма, — усклікае **Семён Міхайлавіч Будзённы.** Магутнае «ўра» патрасае зводы зала.

Старшыня нарады тав. **Бенек** перадае дэлегатам, што на нараду прыбыў народны паэт **Янка Купала.** Паступіла прапанова запрасіць яго ў прэзідыум. Пад гучныя апладысменты дэлегатаў народны паэт рэспублікі ўзыходзіць у прэзідыум і горача паціскае руку маршалу **Семёну Міхайлавічу Будзённаму,** тт. **Валковічу і Чарвякову.**

Слова прадастаўляецца ордэнаносцы **Васілісе Селязнёвай** —загадчыцы фермы калгаса **«Беларуская вёска»**, Лёзнянскага раёна.

Праз залу да трыбуны накіроўваецца дэлегацыя Лёзнянскага раёна ў ліку 13 чалавек на чале з ордэнаносцамі — **Селязнёвай, Башкіравай, Зяньковічам** і **Астапенкай.**

Тав. Селязнёва ад імя калгаснікаў свайго раёна перадае прывітанне таварышу **Сталіну,** кіраўнікам ЦК КП(б)Б і ўрада БССР. Пад гучныя апладысменты яна просіць прэзідыум уручыць альбом лепшых людзей раёна сакратару ЦК КП(б)Б **Нікалаю Фёдаравічу Гікало.**

На ранішнім пасяджэнні выступілі — т. **Рабцаў** — старшы конюх калгаса **«Іскра»**, Хоцімскага раёна, ардэнаносец **Раеўскі** — старшыня калгаса **«Гомельскі пролетарый»**, Лоеўскага раёна, **Людзько** — загадчык малочнай фермы калгаса **«Шлях соцыялізма»**, Горацкага раёна, ордэнаносец **Ляшкова** — птушніца соўгаса **«Пяскі»**, Гомельскага раёна, ордэнаносец **Тітоў** — дэлегат Заходняй вобласці, **Дземідзенка** — загадчык кафедры жывёлагадоўлі Віцебскага ветэрынарнага інстытута, ордэнаносец **Аляшкевіч** — старшы ветурач Капыльскага райземаддзела, **Чумак** — тэхнік штучнага абсемянення калгаса імя **Варашылава,** Мазырскага раёна, **Афанас'ева Елена**—аўчарка калгаса імя **Тэльмана,** Сіроцінскага раёна, **Маковіч Люба** — цялятніца калгаса **«Чырвонае Бярэзіна»**, Бярэзінскага раёна.

У фае залы з'ездаў маршал Совецкага Саюза тав. **Будзённы** фатаграфаваўся з лепшымі конюхамі БССР і дэлегацыяй Лёзнянскага раёна.

ВЯЧЭРНЯЕ ПАСЯДЖЭННЕ 6 САКАВІКА

За сталом прэзідыума тт. **Галадзед, Чарвякоў, Бенек, Картукоў** і ордэнаносцы соцыялістычнай жывёлагадоўлі. Увесь час у рабоце нарады прымае ўдзел маршал Совецкага Саюза Семён Міхайлавіч Будзённы.

Малады комсамолец **Журко Грыгорый** з трыбуны нарады дае абяцанне таварышу **Будзённаму** выгадаваць такіх коней для будзёнаўскай кавалерыі, якія-б дапамаглі ўшчэнт разбіць ворагаў советаў. У сваім калгасе **«Палітаддзелец»**, Бешанковіцкага раёна, т. Журко ўжо гадуе 13 такіх коней.

Якая вялікая і неразрыўная сувязь Чырвонай арміі з калгасамі, соўгасамі і заводамі! Сведчаннем гэтага — тэлеграма, якая атрымана з Віцебска на імя нарады. Малодшы камандзір ваеннай часці т. **Мятлоў** вітае нараду перадавікоў жывёлагадоўлі, удзельнікам якой з'яўляецца яго жонка Софья Мятлова—даярка соўгаса **«Крынкі»**, Лёзнянскага раёна. Знаходзячыся ў радах слаўнай Чырвонай арміі т. Мятлоў змагаецца за вышыні баявой падрыхтоўкі, рыхтуецца стаць чырвоным лейтэнантам.

Нібы адказваючы свайму мужу тав. **Мятлова** гаворыць з трыбуны нарады:

— Мой муж у Чырвонай арміі— стаханавец, а я ў соўгасе — стаханаўка. У 1935 годзе надаіла ад кожнай каровы сваёй групы па 3.842 літры малака. Абавязваюся давесці ўдой да 4.500 літраў.

Нарада пасылае адказную тэлеграму т. Мятлову, у якой выказвае пажаданні далейшых поспехаў ва вучобе.

У часе вячэрняга пасяджэння нараду прыбылі вітаць удзельнікі матацыкла-лыжнага пераходу Ленінград—Менск—Ленінград бронетанкісты ленінградскай ваеннай акругі. Уся зала ўстае і горача вітае паяўленне на трыбуне ўдзельнікаў прабегу.

Удзельнікі нарады прымаюць прапанову паслаць праз бронетанкістаў прывітанне абласному камітэту ВКП(б) і ленінградскаму пролетарыяту.

На вячэрнім пасяджэнні выступілі тт. **Міснікаў** — загадчык усебеларускай ветэрынарнай станцыі ў Віцебску, ордэнаносец **Русаковіч** — зоатэхнік соўгаса **«Нача-Шпакоўшчына»**, Ветрынскага раёна, **Дземінскі** — старшыня калгаса **«Чырвоны баец»**, Быхаўскага раёна, **Рэут** — даярка з калгаса **«Чырвоны баец»**, Барысаўскага раёна, **Каленік** — калгасніца арцелі імя **Сталіна,** Менскага раёна, **Майсеевіч** — старшыня калгаса **«Краіна советаў»**, Дзяржынскага раёна, **Васілеўская** — цялятніца калгаса **«Ударнік»**, Сенненскага раёна.

РАНІШНЯЕ ПАСЯДЖЭННЕ 7 САКАВІКА

Адзін за другім на трыбуну падымаюцца знатныя людзі калгасаў — перадавікі соцыялістычнай жывёлагадоўлі. Прамовы насычаны багатым вопытам вялікай работы, вясёлым калгасным жыццём.

Ордэнаносец **Шынкароў** — брыгадзір племгаса «Ціманава», Клімавіцкага раёна, загадчыца фермы **Зябко** з Халопеніцкага раёна, **Галуб'ева Марына** з Парыцкага раёна расказваюць як добра стала жыць.

— За сваю адданую і сумленную работу я атрымала ордэн Леніна, гаворыць даярка соўгаса «Рачкавічы», Чырвонаслабодскага раёна тав. **Рыгаровіч** Софія. — Гэты ордэн я атрымала ад нашага совецкага ўрада і таварыша Сталіна, які бачыць нашу работу і цэніць нас. Я абавязваюся даць сёлета не 4 тысячы, як летась, а 6 тысяч літраў малака ад сваёй групы кароў.

Аб заможным жыцці ў сваім калгасе расказвае ордэнаносец **Абойкава** — дэлегатка з Заходняй вобласці. Яна ў калгасе выпрацавала 550 працадзён, на якія атрымала па 5 кілограмаў збожжавых, 7 кілограмаў бульбы і па 2 рублі грошай.

— За шчаслівае і заможнае жыццё дзякую роднаму бацьку— таварышу Сталіну, гаворыць тав. Абойкава.

Тав. Абойкава выклікае на соцыялістычнае спаборніцтва ордэнаносца Башкіраву — даярку соўгаса «Крынкі», Лёзнянскага раёна. Яна бярэ на сябе абавязацельства атрымаць у 1936 годзе па 4 тысячы літраў малака ад кожнай каровы і давесці сутачны прырост маладняка да 1000 грам.

Цёпла сустрэлі дэлегаты выступленне выдатнай цялятніцы БССР **Анны Андрэеўны Канстанцінавай** з соўгаса «Судкова», Хойніцкага раёна. За сваю дзесяцігадовую работу на ферме Анна Андрэеўна выгадавала 1.669 цялят, не дапусціўшы ні аднаго выпадку адыходу. Саюзны ўрад узнагарадзіў т. Канстанцінаву А. А. ордэнам Леніна.

У канцы ранішняга пасяджэння з яркай і глыбоказмястоўнай прамовай выступіў загадчык сельскагаспадарчага аддзела ЦК КП(б)Б тав. **Картукоў.**

Тав. Картукоў падрабязна спыняецца на вопыце перадавікоў соцыялістычнай жывёлагадоўлі Совецкай Беларусі. Ён указвае на неабходнасць перанясення вопыту гэтых людзей ва ўсе калгасы.

Асаблівую ўвагу тав. Картукоў звяртае на арганізацыю далейшай вучобы работнікаў калгасных і соўгасных ферм.

У часе ранішняга пасяджэння выступілі з прамовамі тт. **Балбановіч** — даярка соўгаса «Покрышава», Трэскага раёна, **Дубатоўка** — старшыня калгаса «Новы жыцень», Старадарожскага раёна, ордэнаносец **Кліменкоў** — загадчык фермы калгаса імя Кірава, Шклоўскага раёна, **Мельнічанка** — загадчык фермы калгаса «Пролетарскі шлях», Брагінскага раёна, **Семак** — брыгадзір малочнай фермы з Старобінскага раёна, ордэнаносец **Рыняк** — старшыня калгаса «Чырвоны баец», Кіраўскага раёна, **Зернова**—даярка калгаса імя Леніна, Слуцкага раёна, **Глушакоў** — старшы зоатэхнік Наркамзема БССР.

ВЯЧЭРНЯЕ ПАСЯДЖЭННЕ 7 САКАВІКА

Учора ўвечары ўсебеларуская нарада перадавікоў соцыялістычнай жывёлагадоўлі закончыла сваю работу.

На вячэрнім пасяджэнні з вялікай прамовай выступіў **Семён Міхайлавіч Будзённы.**

Сваю красачную і глыбока-змястоўную прамову тав. Будзённы прысвяціў перадавікам соўгасаў і калгасаў, іх далейшай вучобе і рабоце.

У заключэнне тав. Будзённы выразіў упэўненасць, што ордэнаносная БССР з гонарам выканае вялікія задачы ў галіне развіцця жывёлагадоўлі ў 1936 годзе.

Ад імя нарады тав. Бенек выказаў вялікую ўдзячнасць правадыру народаў таварышу Сталіну і саюзнаму ўраду за выключную ўвагу і дапамогу Совецкай Беларусі. Тав. Бенек падзякаваў Семёна Міхайлавіча Будзённага за ўдзел у нарадзе.

Нарада зацвердзіла тэкст дагавору па соцспаборніцтву з Заходняй вобласцю.

Таварышы БУДЗЁННЫ, ВАЛКОВІЧ, ЧАРВЯКОЎ і КАРТУКОЎ з дэлегатамі Лёзнянскага раёна.

Фото САЛАВЕЙЧЫКА.

Прамова тав. БАТОЎКІНА Нікіты Ермалаевіча

КОНЮХ КАЛГАСА «КАСТРЫЧНІК», ПРАПОЙСКАГА РАЕНА, УЗНАГАРОДЖАНЫ ОРДЭНАМ ЛЕНІНА

Таварышы, дазвольце мне ад імя калгаснікаў і калгасніц Прапойскага раёна перадаць прывітанне нашаму дарагому, шаноўнаму і мудраму таварышу Сталіну **(апладысменты)**, пажадаць яму шчаслівага жыцця і доўгіх год! **(Апладысменты).**

Я, таварышы, стары конюх, працуючы 6 год конюхам у калгасе, дабіўся вялікіх поспехаў. Калі хто-небудзь з фашыстаў уздумае напасці на нас, то мы на сваіх баявых калгасных конях дадзім ім знішчальны адпор. **(Бурныя апладысменты).**

Чарвякоў. Раскажыце, як вы коней даглядаеце.

Батоўкін. Коней я добра даглядаю. Люблю іх, як свае рукі і вочы. Яны ў мяне заўсёды чыстыя, добрыя. Ніколі я не лічыўся з часам, абы толькі зберагчы коней. Асабліва добра берагу я матак. Я рыхтую здаць да гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі выгадаванага мною добрага жарабка для нашай доблеснай Чырвонай арміі.

Галадзед. А вы жарэбных матак аслабаняеце ад работы?

Батоўкін. Аслабаняем. За шэсць месяцаў да выжарэбкі пераводзім на лёгкую работу, — падвозіць кармы і на іншыя хатнія работы. На цяжкую работу не пускаем. За два месяцы да выжарабкі мы зусім іх аслабаняем ад работы.

Галадзед. А да калгаса што вы рабілі?

Батоўкін. Працаваў на сваёй гаспадарцы, у гразі капаўся, як чарвяк, а зараз — жыццё радаснае і вясёлае. Як быццам толькі на свет нарадзіўся. **(Апладысменты).**

Няхай жыве наша любімая партыя, няхай жыве таварыш **Сталін! (Апладысменты).**

Прамова тав. ЛЯШКОВАЙ Марыі Пятроўны

ПТУШНІЦА СОЎГАСА «ПЯСКІ», ГОМЕЛЬСКАГА РАЕНА, УЗНАГАРОДЖАНАЯ ОРДЭНАМ «ЗНАК ПОЧЕТА»

Таварышы, дазвольце мне перадаць прывітанне ад рабочых соўгасаў і калгаснікаў Гомельскага раёна нашаму любімаму правадыру таварышу Сталіну! **(Апладысменты).**

Дазвольце мне перадаць прывітанне любімым таварышам Варашылаву і Будзённаму. **(Апладысменты).**

Перадаю наша калгаснае стаханаўскае прывітанне кіраўнікам партыі і ўрада Беларусі таварышам Гікало, Галадзеду і Чарвякову. **(Апладысменты).**

Таварышы, я атрымала вельмі вялікую ўзнагароду за сваю сумленную працу — ордэн «Знак почета». І я хачу, таварышы стаханаўцы, лепшыя жывёлаводы, падзяліцца з вамі вопытам і расказаць, як змагла дабіцца таго, каб паехаць у Маскву, паціснуць руку нашаму любімаму правадыру таварышу Сталіну, атрымаць ордэн.

Я працую ў соўгасе «Пяскі» з 1933 года, працую на птушкаферме. Наша птушкаферма выканала заданне на 175 проц. і дабілася кошту яйка ў 29 капеек. Гэта значна танней планавага, але гэта яшчэ дорага. Мы працуем не толькі без страт, але яшчэ дабіліся ад двух тысяч нясушак 36.000 рублёў прыбытку. Мы, таварышы, павінны адносіцца да птушкі па-соцыялістычнаму, з любоўю, і тады мы зможам дабіцца ў 1936 годзе яшчэ лепшых рэзультатаў.

Я ў 1933 годзе выгадавала 3.700 кур без адыходу. Я атрымала іх сутачнымі куранятамі і на працягу чатырох месяцаў выгадавала. У 1934 г. я выгадавала 14.000 штук куранят. Мы поўнасцю іх здалі дзяржаве. Яны важылі праз два месяцы ад кілограма да 800 грам.

Я вывучыла тэхніку працы, прымяняючы свой асабісты метад. Я вывучыла як трэба даглядаць птушак, каб дабіцца высокай яйканоснасці. Я дабілася 145 яек на кожную нясушку. Я дала са сваёй групы 100 рэкардыстак, якія нясуць па 200 яек.

Таварышы, я хачу, каб мне дапамаглі стаць тэхнікам. Даю абяцанне вучыцца на тэхніка, працаваць і вучыцца. **(Апладысменты)**

Не бачыла я ніколі ў жыцці такой роскашы, якую нам прадаставілі ў той гасцініцы, дзе мы змяшчаліся, і ў Крэмлі, дзе адбывалася нарада. Калі я ўбачыла таварыша Сталіна, то мне не верылася, што я сапраўды яго бачу. Толькі калі я паціснула яму руку, то пераканалася, што гэта не сон.

Калі нам уручалі ордэны, тав. Калінін нас віншаваў і жадаў поспехаў. Калі мы прыехалі дамоў, то нас у раёне і ў калгасе сустрэлі вельмі радасна, віншавалі нас і стварылі ўсе ўмовы для работы.

Я дала абяцанне даць 170 яек ад кожнай нясушкі. Кожная рэкардыстка павінна даць 250 яек. Мне павінна дапамагчы ў гэтым уся партарганізацыя.

Няхай жыве наш любімы правадыр таварыш Сталін! **(Апладысменты).**

Няхай жыве таварыш Варашылаў! **(Апладысменты).**

Няхай жыве Чырвоная армія! **(Апладысменты).**

Няхай жывуць нашы таварышы Гікало, Галадзед і Чарвякоў! **(Апладысменты).**

Прамова тав. БЕЛАЙ Лізы Васільеўны

БРЫГАДЗІР АДКОРМАЧНАЙ БРЫГАДЫ СОЎГАСА ІМЯ СВЕРДЛОВА, ДЗЕРЖЫНСКАГА РАЕНА, УЗНАГАРОДЖАНА ОРДЭНАМ ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА

Таварышы, дазвольце перадаць шчырае прывітанне нашаму любімаму правадыру народаў таварышу Сталіну **(апладысменты)**, тт. Варашылаву і Будзённаму і нашым ордэнаносцам тт. Гікало і Галадзеду **(апладысменты)** і ўсім стаханаўцам Совецкага Саюза, у тым ліку і Совецкай Беларусі. **(Апладысменты).**

Таварышы, я так шчаслівa, што бачыла дарагога, нашага любімага таварыша Сталіна. Самыя шчаслівыя дні майго жыцця гэта дні, якія я правяла ў Маскве на нарадзе, дзе я бачыла таварыша Сталіна і іншых кіраўнікоў нашай партыі і ўрада. На гэтай нарадзе я выступала і дала таварышу Сталіну абяцанне, што буду пастаханаўску працаваць у 1936 годзе.

Раскажу вам, таварышы, якім чынам дабілася я такіх вялікіх поспехаў у рабоце маёй. У соўгасе імя Свердлова я працую 10 год, з іх свінаркай 7 год. За добрую работу ў 1935 годзе ЦВК БССР узнагарадзіў мяне ганаровай граматай. Самае галоўнае ў маёй рабоце на адкормачным пункце — гэта правільны падыход да свіней па росту, вазе і характару. Я гатую корм такі, які больш па смаку свінням. Дзякуючы гэтаму ў мяне атрымалася на маладую свінню сутачнай прывагі па 800, 1.200, 1.500 і 3.000 грамаў.

Таварышы, я вельмі задаволена тым, што вышла ў перадавыя людзі нашай радзімы. З трыбуны гэтай нарады яшчэ раз заяўляю, што абавязацельства, якое я ўзяла на ўсесаюзнай нарадзе перад таварышам Сталіным — даць 85 пудоў мяса на адну свінаматку — з гонарам выканаю. Ордэн, які я атрымала, абавязвае мяне яшчэ больш і лепш працаваць. Заклікаю ўсіх нашых свінарак працаваць яшчэ лепш.

Няхай жыве наш любімы правадыр таварыш Сталін, наша вялікая большэвіцкая партыя, няхай жывуць тт. Гікало і Галадзед і ўсе нашы стаханаўцы! **(Апладысменты).**

Прамова тав. МАКОВІЧ Любы Сяргееўны

ЦЯЛЯТНІЦА КАЛГАСА «ЧЫРВОНАЯ БЯРЭЗІНА», БАБРУЙСКАГА РАЕНА

Таварышы, дазвольце перадаць прывітанне ад калгаса «Чырвоная Бярэзіна» таварышу Сталіну **(апладысменты)**, таварышам Галадзеду і Гікало **(апладысменты)** і кіраўнікам Чырвонай арміі — тт. Варашылаву і Будзённаму. **(Апладысменты).**

Я прыехала сюды для таго, каб падзяліцца вопытам сваёй работы. Я — цялятніца. З 1932 года даглядаю цялят. Цяляты ў мяне добрыя, сутачны прырост да 700 грамаў. Але я хачу дагнаць да 800 грамаў. Калі я ішла даглядаць цялят, мяне некаторыя пужалі, што я не спраўлюся з гэтай работай. Але я не струсіла.

У 1935 годзе я выгадавала 67 цялят, а ў 1936 годзе ўжо гадую 36 галоў новага маладняка, а к канцу года бяру абавязацельства выгадаваць 77. Цялят я даглядаю па гадзінах. Адразу я іх прымаю ад маткі. Да 10 дзён кармлю малаком маткі, да 20 дзён пераводжу на агульнае малако, а потым пачынаю прыбаўляць пойла з аўсянай мукі.

Чыстку цялят праводжу штодзенна. Уборку цялятніка раблю таксама штодзенна, а дэзінфекцыю — кожныя пяць дзён. Пасуда для кожнага цяляці ў мяне асобная. У цялятніку ў нас цёпла; ёсць умывальнік, ручнік. Для таго каб паіць цёплым малаком, у нас ёсць электрычныя каструлі.

Бенек. Колькі на працадзень атрымалі?

Маковіч. Я жыла ў беднай сям'і, без бацькі. Хадзіла працаваць па багатых, па памешчыках. Жыла вельмі бедна. А зараз дазвольце пажадаць вам усім такога жыцця як маё. Я выпрацавала 357 працадзён. Атрымала 955 рублёў грашыма **(апладысменты)**, 620 кілограмаў зярна, 1.060 кілограмаў бульбы, апрача таго, што зняла з сваёй сядзібы **(апладысменты)**, фуражу 1.190 кілограмаў, гародніны 800 кілограмаў, салавіны 160 кілограмаў. Жыву вельмі добра і весела.

Няхай жыве Чырвоная армія і маршалы Совецкага Саюза тт. Варашылаў і Будзённы! **(Апладысменты).**

Няхай жыве наш родны бацька таварыш Сталін! **(Апладысменты, крыкі «ўра»).**

Няхай жывуць нашы ордэнаносцы тт. Гікало і Галадзед! **(Апладысменты).**

РАДАСНАЕ БУДЗЕ ВЯСЕЛЛЕ

З маленства дружыла Ніна Аксёнчык з Паўлікам Кашканам. І вось зусім нядаўна, якіх-небудзь два-тры тыдні назад, Паўлік пасватаўся да яе. Павел хлопец добры, лепшы конюх у калгасе. За мінулы год выпрацаваў 600 працадзён. Чаму-ж не пайсці замуж за такога хлапца?

Так прышла радасная перамена ў яе жыцці. Ужо збіраліся калгаснікі гуляць вяселле сваёй лепшай ударніцы. Падбіраліся чырвоныя шаферы і шаферкі. Вяселле рыхтавалася багатае.

І якраз у гэты час адбылася другая радасная падзея. З раёна прышла дэпеша, што Ніна Аксёнчык — лепшая свінарка калгаса «Калінінск» — пасылаецца ў Маскву на нараду па жывёлагадоўлі.

Вяселле прышлося адкласці.

⁂

Доўга гасціла Ніна Аксёнчык у чырвонай сталіцы. Павел Кашкан засумаваў. Ён пісаў гарачыя пісьмы ў Крэмль «для перадачы на рукі свінарцы Ніне Гаўрылаўне». Ён пісаў пра сваю работу і адкладзенае вяселле, пытаўся, ці не сумна ёй, бо вельмі-ж далёка Ніна ад свайго калгаса і ад яго...

«Які-ж ты смешны, Паўлік, — думала Ніна з усмешкай на вуснах, — чаго-ж мне сумаваць у Маскве, сярод такіх людзей?..»

Ніколі раней Ніна не была ў горадзе. А тут Масква, аб якой яна так часта марыла, пра якую спявала, Масква, дзе жыве Сталін...

На шумных вуліцах Масквы, на станцыях метро, у залах тэатраў яна квітнела радасцю і шчасцем за сябе, за сваю вялікую радзіму. І з кожнай гадзінай расло жаданне хутчэй убачыць таго, хто прывёў яе і ўсю краіну да шчаслівага, радаснага жыцця, таго, пра каго спявала ў песнях.

... Электрычнае святло залівала вялікую залу Крэмлёўскага палаца. Адкрывалася нарада. Людзі паднімаліся з месц і з нецярплівасцю чакалі з'яўлення ў прэзідыуме любімага і роднага Сталіна. Пад гром апладысментаў, якія патрасалі стары Крэмлёўскі палац, ён скромна ўвайшоў і заняў месца ў прэзідыуме сярод членаў палітбюро і ўрада. Доўга не змаўкалі апладысменты, доўга раздаваліся воклічы на ўсіх мовах у гонар правадыра.

Дні нарады, калі яна, радавая свінарка, у прыгожай Крэмлёўскай зале разам са Сталіным, з кіраўнікамі партыі і ўрада, слухала прамовы герояў соцыялістычнай жывёлагадоўлі, былі самымі радаснымі ў жыцці Ніны Аксёнчык.

У такія мінуты чалавек прыпамінае ўсё сваё жыццё... Зусім маленькай Ніна засталася без бацькоў, няньчыла кулацкіх дзяцей. Падрасла крыху і ў 1928 годзе пайшла ў калгас, стала даглядаць калгасных свіней. Толькі 8 свіней было тады ў калгасе. А за 8 год вырасла і ўмацавалася свінагадоўчая ферма. Летась Аксёнчык даглядала 7 свінаматак, якія прывялі 90 парасят. Усіх парасят захавала. Ад прыплоду кожнай свінаматкі атрымала 50,8 пуда мяса. За гэта яна атрымала такі гонар —быць у Маскве на нарадзе, бачыць роднага Сталіна.

...Праходзілі дні як сон. Што дзень, то новая радасць. Позна вечарам, калі варочаліся з тэатра, кіраўнік дэлегацыі паведаміў аб узнагародзе майстроў жывёлагадоўлі ордэнамі. Ніна пачырванела ад радасці, смяялася і плакала.

Заплакалі ад радасці старыя барадатыя мужчыны Батоўкін, Барушкоў і Ганус, якім перавалiла ўжо за 60 год.

У апошні вечар перад ад'ездам з чырвонай сталіцы, узнагароджаныя дэлегаты Совецкай Беларусі атрымлівалі ордэны. Да стала старшыні прэзідыума ЦВК СССР падыходзілі беларускія даяркі, свінаркі, конюхі, цялятніцы. Яны паціскалі рукі Сталіну, Калініну, Молатаву. Сярод іх была і Ніна Аксёнчык.

⁂

Усхваляваная, шчаслівая, з ордэнам «Знак почета» на грудзях варочаецца Ніна ў свой калгас. Паўлік Кашкан, пэўна, ужо ведае пра ўзнагароду сваёй Ніны і чакае яе з нецярплівасцю.

...Пра ўсё гэта Ніна Аксёнчык расказала вярнуўшыся з Масквы ў Менск. Калі закончыўся прыём ордэнаносцаў у СНК БССР, яна звярнулася да тав. Галадзеда.

— Нікалай Матвеевіч, запрашаю вас на маё вяселле.

Нікалай Матвеевіч Галадзед паціскаў рукі маладой свінарцы і прасіў паведаміць, калі будзе вяселле.

А ў калгасе чакалі сваю лепшую свінарку. Там ужо рыхтаваліся да адкладзенага вяселля маладой ордэнаноскі. Багатае і радаснае будзе гэта вяселле.

Уздзенскі раён **А. ЛОСЬ.**

Жанчыны СССР—самыя шчаслівыя жанчыны ў свеце

Жанчына ў краіне Советаў

Жанчына Совецкага Саюза—самая шчаслівая жанчына ў свеце. Няма ў СССР такой галіны народнай гаспадаркі, такога ўчастка дзяржаўнай, гаспадарчай, культурнай, навуковай дзейнасці, дзе-б нароўні з мужчынамі не працавалі-б жанчыны.

ЖАНЧЫНЫ НА ДЗЯРЖАЎНАЙ РАБОЦЕ

Жанчыны — члены ўрада, старшыні раённых выканаўчых камітэтаў, старшыні сельсоветаў — гэта звычайная з'ява ў Совецкім Саюзе. Жанчыны—члены сельсоветаў складаюць 26,4 проц., членаў горсоветаў — 30,9 проц., крайвыканкомаў — 19,1 проц., ЦВК — 17,5 проц. У адной толькі Совецкай Беларусі ёсць 4 жанчыны — члены ЦВК СССР. 41 жанчына — члены ЦВК БССР, 3 жанчыны — старшыні горсоветаў, 1 — старшыня раённага выканаўчага камітэта, 112 жанчын — старшыні сельскіх советаў, 707 жанчын — члены РВК, 54 — члены прэзідыумаў РВК, тысячы членаў сельсоветаў, сотні жанчын кіраўнікоў устаноў, пракурораў, суддзяў і т. д.

ЖАНЧЫНЫ НА ВЫТВОРЧАСЦІ І Ў КАЛГАСАХ

З кожным годам расце колькасць жанчын, занятых у нашай соцыялістычнай прамысловасці. У СССР 8 мільёнаў жанчын работніц і служачых. У цэнзавай прамысловасці БССР у 1931 годзе жанчыны-работніцы складалі 35,8 проц. усіх рабочых, у 1932 — 41,4 проц., а ў 1935 годзе ў цэнзавай прамысловасці БССР было занята 55.818 жанчын — 43,3 проц. усіх рабочых.

Жанчыны — дырэктары прадпрыемстваў, дзесяткі жанчын — начальнікаў цэхаў, сотні брыгадзіраў, майстроў і т. д. 68 жанчын працуюць старшынямі заўкомаў на прадпрыемствах БССР, 5 — старшынямі ЦП саюзаў, 38 членамі прэзідыума ЦСПСБ і ЦП саюзаў. Сярод навуковых работнікаў СССР, напрыклад, у аспірантуры жанчыны складаюць 23,3 проц.

Расце колькасць жанчын-калгасніц на кіруючай калгаснай рабоце, занятых у вядучых, рашаючых галінах калгаснай гаспадаркі.

У 1933 годзе па ўсяму СССР было жанчын — старшынь калгасаў каля 6.000, жанчын членаў праўленняў калгасаў — больш 60.000, брыгадзіраў—28 тысяч, звеннявых арганізатараў — 100.000, жанчын — загадчыкаў таварных ферм — 9 тысяч, трактарыстак — 7.000. За два гады колькасць жанчын на кіруючай калгаснай працы павялічылася ў некалькі разоў. Толькі ў 81 раёне БССР зараз 83 жанчыны — старшыні калгасаў, тысячы брыгадзіраў, звеннявых, загадчыц калгасных таварных ферм.

Імёны гераінь калгасных і соўгасных палёў **Марыі Дземчэнка, Пашы Ангелінай,** жанчын інжынераў Джапарыдзе, Терахавай, Карылёвай, парашутыстак Камневай, Фёдаравай, Якаўлевай і інш. вядомы не толькі ў СССР, але і за мяжой. 18 калгасніц і работніц соўгасаў БССР узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага чырвонага сцяга, «Знак почета».

У 1935 годзе ў БССР было 136 трактарыстак. Зараз на курсах механізатарскіх кадраў рыхтуюцца 557 жанчын-трактарыстак. 6 трактарыстак на трактарах ЧТЗ, 11 камбайнерак, 7 брыгадзіраў трактарных брыгад, 8 ільноцерабільшчыц на шыроказахватных машынах ВНІЛ.

АХОВА МАЦЕРЫ І ДЗІЦЯЦІ

Мільярды рублёў совецкая дзяржава штогод укладвае ў справу аховы мацеры і дзіцяці. Расце колькасць дзіцячых яслей, кансультацый, радзільных дамоў і т. д.

У 1935 годзе па СССР мелася 5.631.700 ясельных месц, на 1936 год запраектавана 6.462.200 ясельных месц. У дашкольных установах у 1935 г. знаходзілася 5.858.000 дзяцей, у 1936 годзе будзе ахоплена 6.920.800 дзяцей.

У БССР у 1935 годзе працавалі 210 пастаянных яслей у горадзе з ахопам 10.500 дзяцей і 1.400 у соўгасах, калгасах і МТС з ахопам 38.000 дзяцей. У часе палявых работ у калгасах і соўгасах працавала 5.600 сезонных яслей, абслугоўваўшых 148.500 дзяцей. У 1936 годзе ў гарадах у 215 яслях будзе выхоўвацца 11.125 дзяцей. У калгасах і соўгасах будзе 1.675 пастаянных яслей на 41.870 дзяцей і 7.326 сезонных яслей на 220.510 дзяцей.

Павялічваецца колькасць радзільных дамоў, акушорскіх пунктаў. Калі ў 1935 годзе ў БССР было 50 калгасных радзільных дамоў і 15 акушорскіх пунктаў, то ў 1936 годзе будзе 278 калгасных радзільных дамоў і 400 акушорскіх пунктаў.

Па ініцыятыве таварыша Сталіна ў статут сельскагаспадарчай арцелі ўнесен пункт аб прадастаўленні калгасніцам адпачынку за месяц да родаў і на месяц пасля родаў.

МАРЫЯ КАЎДЗЕРКА

Вярнулася Марыя Францаўна Каўдзерка з усесаюзнай нарады перадавікоў жывёлагадоўлі дамоў і не пазнала сваёй кватэры. Нікеліраваны ложак, мяккая канапа, добрыя крэслы, гардзіны на вокнах. А тут яшчэ дзеці—кожны паказвае свае абновы: бацінкі, сукенкі. Гэта райком партыі і кіраўніцтва соўгаса падрыхтавалі падарунак сваёй ордэнаносцы.

15 гадоў працуе Марыя Францаўна ў соўгасе «Дабрынь», Ельскага раёна. Прышла яна ў соўгас 15-гадовым падросткам, забітай, зморанай непасільнай працай на памешчыцкіх і кулацкіх палях. На працы ў памешчыка Анзельмана памёр яе бацька, пакінуўшы жонку і двух дзяцей, з якіх старшаму было тры гады, а малодшай —Марыі — 1 год. На працы ў памешчыка надарвалася і памёрла матка Марыі. 20 гадоў за тры рублі ў месяц даіла яна памешчыцкіх кароў. На палях памешчыка пачалося і працоўнае жыццё самой Марыі. 9-гадовай дзяўчынкай хадзіла яна жаць і палоць жыта за 10 капеек у дзень.

У 1921 годзе Марыя Каўдзерка разам з старшым братам прышла ў соўгас. Шэсць гадоў працавала на палявых работах. А з 1927 года яе перавялі на догляд кароў.

10 кароў даглядае тав. Каўдзерка. З трох гадзін раніцы пачынае яна свой працоўны дзень. Да 4 гадзін трэба падаіць кароў, потым накарміць, пачысціць, а каторую і падмыць. І не проста карміць і даіць. Кожная карова мае свой характар, свае капрызы, да кожнай патрэбен асобны падыход.

«За каровай патрэбен догляд, як за дзіцем. Карова любіць смачна паесці, тады яна і малака дасць многа, і малака добрага», заяўляе тав. Каўдзерка.

Марыя Францаўна даўно паставіла перад сабой мэту дабіцца ад звычайнай беларускай каровы высокіх удояў. І яна перад тым, як пачаць даіць, чысценька падмые вымя, вытра чыстым ручніком, зробіць масаж.

— Якую карову не дасі Каўдзерка, яна яе прымусіць даваць больш малака, — не раз заяўляў дырэктар соўгаса.

Ад сваіх 10 кароў Каўдзерка надойвае 90—100 літраў малака ў дзень. А такія каровы, як «Галандка» і «Любімая» даюць 20 і 25 літраў.

Вось за гэта і паслалі Марыю Францаўну Каўдзерка на ўсесаюзную нараду перадавікоў жывёлагадоўлі, за гэта і ўзнагародзіў яе саюзны ўрад вышэйшай узнагародай — ордэнам **Леніна.**

Любіць Марыя Францаўна сваіх кароў, песціць іх, як дзяцей. Любяць і каровы сваю даярку, прывыклі да яе. За час адсутнасці тав. Каўдзерка яе каровы збавілі ўдой на 30 проц.

«Але нічога, я хутка навярстаю; яны ў мяне пачнуць даваць малака яшчэ больш, чым раней. Не дарма-ж я ў сваім прывітанні ад імя дэлегатаў Совецкай Беларусі пры атрыманні ордэнаў абяцала партыі і ўраду і асабіста таварышу Сталіну атрымаць 4.500 літраў малака ад простай беларускай каровы. Маё слова моцнае. Абяцала — значыць выканаю», — цвёрда і ўпэўнена заяўляе Марыя Францаўна.

А. ЦЫПІНА.

> „Працаднямі калгас вызваліў жанчыну і зрабіў яе самастойнай. Яна цяпер працуе ўжо не на бацьку, пакуль яна ў дзяўчатах, не на мужа, калі яна замужам, а перш за ўсё на сябе працуе. Вось гэта і значыць вызваленне жанчыны-сялянкі, гэта і значыць калгасны лад, які робіць жанчыну працоўную роўнай усякаму мужчыне працоўнаму. Толькі на гэтай базе, у гэтых умовах маглі з'явіцца такія выдатныя жанчыны“. (Сталін)
>
> *(10 лістапада 1935 г. на прыёме калгасніц-пяцісотніц у Крэмлі)*



НА ЗДЫМКУ: група жанчын старшынь ЦК профсаюзаў (злева направа): у першым радзе—тт. **МАЛЬКОВА** Анастасія Сямёнаўна — ЦК саюза швэйнікаў, **АРЦЮХІНА** Аляксандра Васільеўна — ЦК саюза рабочых бавоўняна-папяровай прамысловасці, **КАГАНОВІЧ** Марыя Маркаўна—ЦК саюза трыкатажнікаў; другі рад тт. **МАСЛЕНІКАВА** Аляксандра Іванаўна — ЦК саюза рабочых шаўковай прамысловасці, **КУРКІНА** Марыя Нікалаеўна — ЦК саюза рабочых пяньковай прамысловасці. Фота П. Копасава (Саюзфото).

Знатныя жанчыны аднаго калгаса

На ўвесь Лёзнянскі раён славіцца калгас «Беларуская вёска», Вялешкоўскага сельсовета. Славіцца сваімі ўраджаямі, жывёлай, добрай арганізацыяй працы. А больш за ўсё славіцца і ганарыцца калгас «Беларуская вёска» сваімі выдатнымі жанчынамі.

Вось **Кавалёва Аўдоцця Цярэнцеўна** — член ЦВК БССР. Не гледзячы на свае 60 год, яна на рабоце не ўступае і маладым. У мінулым годзе яе вылучылі адказнай за лён.

Аўдоцця Цярэнцеўна натрапвала за дзень на машыне Гарлачова каля трох цэнтнераў ільноволакна. Яна дапамагла хутчэй апрацаваць лён многім суседнім калгасам. За сваю працу Аўдоцця Кавалёва ўзнагароджана граматай ЦВК БССР і некалькі раз прэміравана.

Або вазьміце **Селязнёву Васілісу Ермалаеўну.** Васіліса Ермалаеўна ўдава. У яе пяцера малых дзяцей. Але гэта не перашкаджае ёй быць лепшай стаханаўкай у калгасе. Яна вывела свае аўцагадоўчую і свінагадоўчую фермы ў перадавыя фермы па раёну. За ўвесь час сваёй працы яна не дапусціла ні аднаго выпадку падзяжу свіней, авечак. Яна дабілася тоны апаросу ад кожнай свінаматкі. За адданую, гераічную працу ў калгасе Васіліса Ермалаеўна ўзнагароджана саюзным урадам **ордэнам Працоўнага чырвонага сцяга.**

Тав. Селязнёва — член прэзідыума сельскага совета, старшыня жывёлагадоўчай секцыі сельсовета—працуе ў рэдкалегіі калгаснай насценнай газеты.

Будучы ў Маскве на ўсесаюзнай нарадзе перадавікоў жывёлагадоўлі, тав. Селязнёва дала абяцанне ўраду, Цэнтральнаму Камітэту партыі і асабіста таварышу **Сталіну** працаваць яшчэ лепш, зрабіць свае фермы перадавымі не толькі па раёну, але і па рэспубліцы.

На свінагадоўчай ферме калгаса «Беларуская вёска» працуе і **Астапенка Малання Кірылаўна.** За ўвесь час у групе свіней, якіх даглядала Малання, не было ні аднаго выпадку падзяжу маладняка. Самы большы прыплод парасят на свінаферме ў групе свінаматак, якіх даглядае Астапенка.

Ёсць у Астапенкі адна свінаматка «Дунька». Гэта «Дунька» за мінулы год дала 40 парасят, якіх Астапенка ўсіх выгадавала.

Былая батрачка, зараз знатны чалавек калгаса, Малання Кірылаўна пабывала ў Маскве на нарадзе перадавікоў жывёлагадоўлі, бачыла і гаварыла з кіраўнікамі партыі і ўрада, гаварыла з правадыром народаў таварышам Сталіным.

Совецкі ўрад ацаніў працу Астапенкі Маланні, узнагародзіў яе ордэнам **«Знак Почета».**

Але не толькі Кавалёвай, Астапенка і Селязнёвай ганарыцца калгас «Беларуская вёска». Вялешкаўскаму сельсовету, ды і ўсёй Лёзняншчыне, вядомы імёны такіх перадавых калгасніц, як Талкачова Ульяна, Маскалёва Гаша і Усачэнка Акуліна, якія працуюць на малочна-таварнай ферме, як Кавалёва Фруза — свінарка, Сінякова Маша — даглядчыца авечак. А стаханаўкі ільнаводства Калінкіна Аўгіння, Квашчанка Ульяна, Сінякова Наталля, Мураўёва Анна, Бузоўская Надзя, Мянжынская Вера.

І шмат яшчэ калгасніц-ударніц, сапраўдных стаханавак мае калгас «Беларуская вёска».

Вось чаму гэты калгас ідзе перадавым па раёну па ўздыму ўраджайнасці, па развіццю жывёлагадоўлі, па выкананню ўсіх гаспадарча-палітычных задач.

С. СЯМАШКА.

ЧЛЕН УРАДА СССР

«Калі прыехала з сесіі ЦВК, я праверыла ў заўкоме, колькі ляжыць заяў рабочых і як разбіраюцца рацыяналізатарскія прапановы».

Так пачынаецца дзеннік члена ЦВК СССР, работніцы гомельскага шклозавода імя Сталіна **Анны Афанасеўны Лёвачкінай.**

Пачынаючы з 22 студзеня 1936 года, яна штодзенна кароценька запісвае, што зрабіла за дзень, як член урада. Але дзеннік не ў стане перадаць усю кіпучую дзейнасць т. Лёвачкінай. Да Анны Афанасеўны ідуць старыя і маладыя, кожны са сваёй скаргай, са сваёй крыўдай, прапановай. Афанасеўна ўважліва слухае кожнага, дае парады, накіроўвае па вернаму адрасу.

Гора і галеча навучылі Анну Лёвачкіну быць чулай і ўважлівай да чужой бяды. Бацька яе Афанасій быў пагельнікам і трубачнікам на шклозаводзе ў горадзе Івот. Аднак, сям'ю не мог пракарміць, хаця і меў дзве прафесіі. Бацька памёр маладым. На руках мацеры засталося трое дзяцей. Анне, самай старэйшай, было 6 год. Сям'я асуджана была на голад і галечу.

Рана пачала працаваць Анна. Дзесяцігадовай дзяўчынкай яна хадзіла на пакос да памешчыка Ханюкіна, працавала ад цямна да цямна. Плаціў ёй пан 15 кап. у дзень, а карміў гнілымі селядцамі. Потым устроілі Анну нянькай. А праз год Анна паступіла на шклозавод, насіла халявы.

На касцюкоўскім шклозаводзе Лёвачкіна працуе з 1933 г. Пачала з уборшчыцы. За некалькі год дасягнула высокай кваліфікацыі, — стала газаўшчыцай. Зусім іншае стала жыццё.

Ударніца на вытворчасці, добрая грамадчыца, Лёвачкіна заваявала павагу ўсіх рабочых. На 7-м з'ездзе советаў СССР яе выбралі членам урада.

«Самым шчаслівым днём у маім жыцці быў дзень, калі выбралі мяне членам урада — расказвае тав. Лёвачкіна. На VII з'ездзе советаў упершыню ўбачыла Сталіна.

У другі раз бачыла Сталіна на сесіі ЦВК СССР—вясёлага, маладога, свежага. Усіх сустракаў ласкавай улыбкай. Дэлегаты з любоўю сачылі за кожным яго рухам, усмешкай, лавілі кожную яго рэпліку. І зараз у вачах маіх стаіць вобраз Сталіна».

Зусім нядаўна Анна Афанасеўна была амаль непісьменнай, чытала па складах. А як выбралі яе членам ЦВК, пачала вучыцца. Зараз яна самастойна чытае газеты, прачытала «Ціхі Дон», асобныя творы Чэхава.

Вялікую работу праводзіць т. Лёвачкіна сярод жанчын, пачынаючы ад барацьбы за чыстую кватэру і канчаючы вывучэнем супроцьгазаў. Яна разгарнула мастацкую самадзейнасць сярод хатніх гаспадынь, арганізавала чырвоныя куткі ў бараках.

Зараз Анна Афанасеўна, маці трох дзяцей, марыць аб паездцы на вучобу, каб яшчэ лепш апраўдваць званне члена ЦВК СССР. Партыя і ўрад ёй у гэтым дапамогуць.

С. ЦЫВЕС.

Жанчына ў краінах капітала

НА СТАНОВІШЧЫ РАБЫНЬ

У краінах, дзе лютуе фашызм, жанчына зведзена на становішча «ніжэйшай істоты», на становішча рабыні.

Жанчына «павінна быць служанкай нацыі і раджаць ёй салдат, даглядаць стомленых ваяк»— прапаведуе нацыянал-соцыяліст Федер.

«Пачэснейшым і вышэйшым прызваннем жанчыны застаецца прызванне жонкі і мацеры» — заяўляе Гебельс, следам за Герынгам, які зварачаецца да жанчын з такім заклікам:

«Жанчына на вытворчасці! Ты можаш быць шчаслівай не на вытворчасці, тваё сапраўднае кола ўплыву — сям'я. Хай мужчыны не гуляюць, прыміся зноў за хатнюю гаспадарку».

На канферэнцыі нацыянал-соцыялістаў у Нюрэнбергу ў 1935 г. Гітлер адкрыта заявіў, што жанчына не можа быць роўнапраўнай.

«У жанчыне мы бачым адвечную маці нашага народу, падругу жыцця, працы і барацьбы мужчын... а «так званае» роўнапраўе жанчын, якога патрабуе марксізм, у сапраўднасці не з'яўляецца роўнапраўем, а пазбаўленнем жанчыны праў, бо роўнапраўе ўцягвае жанчыну ў такую галіну, дзе яна абавязкова будзе пераможана» — заявіў Гітлер.

Сэнс усёй гэтай фашысцкай дэкламацыі адзін: выкінуць жанчын з вытворчасці. Пад прыкрыццём гэтай фашысцкай балбатні аб «вялікім прызванні жанчын» былі выкінуты ўсе жанчыны з парламента і з канцэлярый дзяржаўных устаноў, выгнаны амаль усе настаўніцы са школ і т. д.

Беспрацоўныя жанчыны, якія атрымліваюць дапамогу, павінны штодзенна адпрацоўваць па 3 ці 4 гадзіны. У выпадку адмаўлення, іх пазбаўляюць дапамогі. Такім чынам уводзіцца непрыкрытая прымусовая праца. Работніцы прымусова пасылаюцца ў якасці бясплатных батрачак у вёску для працы ў кулацкіх гаспадарках. У 360 лагерах працоўнай павіннасці лічыцца звыш 30 тысяч жанчын.

Аўстрыйскі фашызм, як і германскі, таксама заклікае жанчын «самаадданай любоўю садзейнічаць аднаўленню радасці любві ў Аўстрыі». Пад прыкрыццём гэтых пышных фраз утвараецца працоўная павіннасць у лагерах, працоўная павіннасць на даму. Тысячы маладых дзяўчын, выкінутых са школ, беспрацоўных, накіроўваюцца фашыстамі на прымусовыя бясплатныя работы.

БЕСПРАЦОЎЕ, ГОЛАД, ЖАБРАЦТВА

Эканамічны крызіс у краінах капітала асабліва жорстка адбіўся на становішчы працоўнай жанчыны. Жанчыны вымушаны працаваць за жабрацкую аплату. Ні ў адной капіталістычнай краіне жанчына не карыстаецца правам роўнай аплаты за роўную з мужчынамі працу. Сярэдняя зарплата работніц у капіталістычных краінах не перавышае 40—50 проц. зарплаты рабочых.

Расце беспрацоўе. Па даных 1934 г. у ЗША — 2,5 мільёна беспрацоўных жанчын, у Германіі — 1.800 тысяч, ва Францыі — 400 тысяч. З 600 тысяч беспрацоўных у Аўстрыі трэцяя частка жанчыны, з якіх 60 проц. не атрымліваюць ніякай дапамогі.

Ва ўсіх краінах расце беспрацоўе сярод жанчын тэхнічнай інтэлігенцыі, дзяржаўных служачых, урачоў, працаўнікоў мастацтва. Ніхто не ўпэўнен у заўтрашнім дні. Брадзяжніцтва, беспрытульнасць жаночай моладзі, самагубствы, рост прастытуцыі — вось што характарызуе становішча працоўных жаночых мас у краінах капітала.

Ні ў адной капіталістычнай краіне няма дзяржаўнага забеспячэння мацярынства. Расце лік жанчын, асуджаных за аборты. Нараджаемасць падае. Папы і фашысты імкнуцца ўсімі сіламі замазаць галоўную прычыну падання нараджаемасці — беспрацоўе, голад, жабрацтва.

РОСТ ПРАСТЫТУЦЫІ

Беспрацоўе, голад, жабрацтва штурхаюць масы жанчын на прастытуцыю. Англійскі журнал «Медикал Рекорд» сцвярджае, што «прастытуцыя ў Германіі вырасла больш, чым у перыяд інфляцыі, калі разам з паданнем цэн на іншыя тавары ўпала і цана на жаночае цела. Утрыманне публічных дамоў стала прыбытковай справай начальнікаў штурмовых атрадаў».

У Варшаве (Польшча) у 1925 годзе лічылася 2.881 зарэгістраваная прастытутка і 6.000 незарэгістраваных. У Італіі ў 1924 годзе па даных міністэрства ўнутраных спраў было 11.924 зарэгістраваных прастытутак.

У Японіі ў 1929 г. у 11.154 дамах цярпімасці было 50.353 зарэгістраваных прастытуткі.

Толькі ў 4 гарадах Кітая: Мукдэне, Пекіне, Цяньцзіне і Кантоне ў 1929 г. было зарэгістраваных 8.500 прастытутак.

У Парыжы (Францыя) з 1920 г. існуе 235 дазволеных дамоў цярпімасці. Ва ўсёй Францыі ў 1923 годзе налічвалася 12 тысяч зарэгістраваных і 74 тысячы незарэгістраваных прастытутак.

За 5 год у Іспаніі было зарэгістравана 20.823 прастытуткі.

За час крызісу колькасць прастытутак значна ўзрасла ва ўсіх капіталістычных краінах.

СТАХАНАЎКІ ШВЭЙНАГА ГІГАНТА

Сярод пяцітысячнага рабочага калектыва фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» імя **Фурман Розы** авеяна славай. Адна з ініцыятараў стаханаўскага руху на фабрыцы, яна з гонарам апраўдвае званне майстра высокай прадукцыйнасці працы і выдатнай якасці. На складанейшай аперацыі тэхналагічнага працэса пашыва паліта — умётка рукавоў — Фурман Роза штодзенна выконвае план на 250—300 процантаў, абслугоўвае дзве істужкі канвеера цэха польтаў. Доля секунды ідзе ў яе на тое, каб працягнуць нітку са стойкі і ўцягнуць яе ў вушка іголкі. Якасць работы—бездакорная.

Лепшая стаханаўка — Фурман і выдатны грамадскі працаўнік. Свае абавязкі — праўорг брыгады і дэпутат гарадскога совета — яна выконвае з тым-жа рвеннем, як і вытворчае заданне на ўчастку. Старая кадравічка, выхаваная партыяй Леніна—Сталіна, Роза Фурман свой далейшы жыццёвы шлях не мысліць па-за радамі партыі і ўступае ў спачуваючыя.

Вялікай любоўю і павагай карыстаецца на фабрыцы **Аля Семянідава.** Майстэрскі ўладаўшы спецыяльнай пецельнай машынай «Рэйс», яна дае на ёй сапраўды соцыялістычную прадукцыйнасць працы, аставіўшы далёка ззаду амерыканскія рэкорды, абслугоўвае адна чатыры істужкі на двух агрэгатах.

Аля не абмяжоўваецца атрыманымі ведамі. Яна яшчэ маладая. Перад ёю шырокая перспектыва для далейшага ўдасканалення, авалодвання вышэйшымі соцыялістычнай навукі і тэхнікі. Загадам Наркамата мясцовай прамысловасці БССР Семянідава, як лепшая стаханаўка, залічана ў менскі Інстытут стаханаўцаў.

У радах знатнейшых жанчын фабрыкі ганаровае месца займае **Зяленка Еўгенія.** Яна вядома не толькі на фабрыцы і ў горадзе, але і ва ўсёй ордэнаноснай БССР, як член ЦВК БССР, як перадавая стаханаўка.

Дасканала вывучыўшы універсальную машыну 31 класа, рацыяналізаваўшы тэхналагічны працэс сваёй аперацыі, Зяленка на ўцяжцы грывенак верху і ніжняга каўняра пінжака дае 160 проц. плана.

Сваёй работай Зяленка поўнасцю апраўдвае давер'е працоўных, якія выбралі яе членам урада.

Высокакваліфікаваная работніца, комуністка **Дора Бялевіч** на складанай аперацыі — выметка бартоў пінжака — выконвае сваё вытворчае заданне на 150 і больш процантаў, даючы найлепшую якасць. Свой метад работы яна перадала работніцам Дзянісавай, Ханінай, Жэлнінай і Клавір, якія сталі дзякуючы ёй аднымі з лепшых стаханаўцаў касцюмнага цэха. Тав. Бялевіч — партыйны арганізатар групы. Яе часта можна бачыць у цэху за чытаннем газет, за гутаркай з рабочымі, за заняткамі з кандыдатамі партыі і спачуваючымі.

Шырока праславілася на Віцебшчыне **Дора Папкова.** Працуючы на адной аперацыі з Розай Фурман — умётка рукавоў, — яна першая ў польтавым цэху апрацавала старыя тэхнічныя нормы, выконваючы іх на 250 і больш процантаў пры выдатнай якасці. Сваю работу ля варштата Дора Папкова спалучае з работай члена горсовета, актыўна прымаючы ўдзел у рабоце яго фінансавай секцыі. Як лепшая стаханаўка, Папкова адміністрацыяй фабрыкі прэміравана новай кватэрай.

Сарбай Ніна, Дабравольская, Якушава, Мясаедава, Фелізат, Менжанская, Лосева—людзі, якія заваявалі сабе славу лепшых стаханаўцаў фабрыкі, герояў рэкорднай колькасці і выдатнай якасці. Такіх выдатных жанчын-стаханавак налічваецца на фабрыцы 360

Жанчына на фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі» займае вядучае месца сярод кіруючага складу. Дырэктар па працы **Мацанка Марыля,** інжынер-эканаміст т. **Карпіна,** заг. аддзелам соцбыту т. **Голанд,** загадчыцы зменамі закройнага цэха тт. **Гітліна** і **Эдэльштэйн,** 15 жанчын-тэхнікаў, 36 брыгадзіраў і майстроў, нядаўна радавыя работніцы, дасканала спраўляюцца са сваімі абавязкамі камандзіраў вытворчасці.

Дзесяткі жанчын узначальваюць партыйнае і прафесіянальнае кіраўніцтва ў цэхах і на ўчастках. Намеснікам сакратара партыйнага камітэта фабрыкі працуе тав. **Міхайлоўская,** партыйнымі арганізатарамі цэхаў і ўчасткаў працуюць тт. **Білевіч, Скупіна** і інш. Намеснік старшыні фабкома т. **Кміт,** сакратар комсамольскага калектыва т. **Бачанава,** праўфарганізатары цэхаў **Белашапская, Шагалова.** 56 жанчын-работніц рэдагуюць насценныя газеты.

Сярод герояў вытворчасці няма ла жанчын, якія паказваюць выдатныя ўзоры авалодання вышэйшымі ваеннай тэхнікі. **Слесарава Дора** (у сучасны момант вылучана інструктарам гаркома комсамола) выдатная лётчыца, снайпер і парашутыстка. Стаханаўкі фабрыкі тт. **Саенка Маня** і **Ляхоўская Маня** без адрыву ад вытворчасці авалодалі парашутнай справай і зараз навучаюцца ў парашутнай школе. Слаўную старонку ў гісторыю фабрыкі ўпісалі 11 дзяўчынстаханавак — **Саенка, Ляхоўская, Сарбай, Бараўчэнка, Радчэнка, Берасnёва, Дробава, Спірыдонава, Каралькова, Альдбрыгіна** і **Слесарава,** якія выдатна зрабілі пешы пераход у супроцьгазах Віцебск—Менск. Яны-ж з'явіліся і ініцыятарамі работы ў супроцьгазах на працягу ўсяго сямігадзіннага рабочага дня ў гонар гадавіны Чырвонай арміі. Сярод працуючых у супроцьгазах было большасць жанчын.

З такімі дасягненнямі сустракаюць 3.320 жанчын-работніц «Сцяга індустрыялізацыі» на чале са сваім перадавым атрадам — 360 стаханаўкамі — Міжнародны комуністычны жаночы дзень — 8 сакавіка. У гэты дзень жанчыны фабрыкі шлюць палкае прывітанне горача любімаму правадыру і настаўніку таварышу **Сталіну** за сваё шчаслівае, раданае жыццё.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.
М. ФЛЯУМЕНБАУМ.



СТАХАНАЎКІ ФАБРЫКІ «СЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ».
СПРАВА НАЛЕВА: МЯСАЕДАВА МАНЯ — стаханаўка цэха польтаў—адна выконвае дзве аперацыі на 160 проц. **ЗЯЛЕНКА ЕЎГЕНІЯ** — стаханаўка касцюмнага цэха, член ЦВК БССР. **БІЛЕВІЧ ДОРА** — стаханаўка касцюмнага цэха, парторг групы. **ЛЯХОЎСКАЯ МАРЫЯ** — стаханаўка. Зараз вучыцца ў Маскве ў парашутнай школе.

МЕМАРАНДУМ ГІТЛЕРА

БЕРЛІН, 7 сакавіка. (БЕЛТА). Сёння раніцай Гітлер прыняў паслоў дзяржаў, падпісаўшых лакарнскі дагавор, і ўручыў ім мемарандум, у якім паведамляе, што Германія лічыць, што франка-савецкі дагавор супярэчыць лакарнскаму дагавору і робіць яго тым самым несапраўдным.

Вось часу Германія з сёнешняга дня не лічыць сябе звязанай лакарнскім дагаворам і абвяшчае аб рэмілітарызацыі Рэйнскай зоны. Для доказу свайго «міралюб'я» Германія, аднак, гатова неадкладна ўвайсці ў перагаворы з Францыяй і Бельгіяй аб заключэнні новага дагавору аб стварэнні нейтральнай зоны на падставе ўзаемнага роўнапраўя. Адначасова Германія гатова падпісаць з Францыяй і Бельгіяй дагавор аб ненападзе на 25 год.

Германія прапануе ўсім мяжуючым з ёю на ўсходзе дзяржавам, у прыватнасці Літве, падпісаць пакты аб ненападзе, аналагічныя заключанаму паміж Германіяй і Польшчай пакту. У заключэнне ў мемарандуме ўказваецца, што з гэтага часу Германія лічыць сваё роўнапраўе поўнасцю дасягнутым і што тым самым адпадае асноўная прычына, папягнуўшая выхад Германіі з Лігі нацый.

Прамова Гітлера у рэйхстагу

БЕРЛІН, 7 сакавіка. (БЕЛТА). Гітлер выступіў сёння ў рэйхстагу з прамовай, у якой агаласіў мемарандум аб разрыве Германіяй лакарнскага дагавору, прычым заявіў, што германскія вайсковыя часці сёння раніцай ужо занялі Рэйнскую зону.

У заключэнне Гітлер абвясціў цяперашні рэйхстаг распушчаным і назначыў на 29 сакавіка выбары ў новы рэйхстаг.

Уступленне германскіх войск у дэмілітарызаваную зону

ЛОНДАН, 7 сакавіка. (БЕЛТА). Як перадае кёльнскі карэспандэнт Рэйтэр, уступленне германскіх войск у Рэйнскую дэмілітарызаваную зону пачалося сёння, у 5 г. раніцы. Паведамляюць, што германскія войскі ўвайшлі ў Дэйтц, размешчаны на ўсходнім беразе Рэйна супроць Кёльна.

◆

Жэнеўскія колы аб рашэнні Гітлера

ЖЭНЕВА, 7 сакавіка. (БЕЛТА). Рашэнне Гітлера дэнансаваць лакарнскі дагавор і ўвесці войскі ў дэмілітарызаваную Рэйнскую зону, хоць яно і чакалася з некаторага часу, выклікала ў міжнародных колах Жэневы рэзкае асуджэнне. У гэтым грубым акце бачаць новае пацвярджэнне ваяўнічых намераў германскага фашызма, якія поўнасцю апраўдваюць словы Сталіна, указаўшага, што адзін з галоўнейшых ачагоў вайны знаходзіцца ў германскай зоне. У колах Лігі нацый лічаць, што аднабаковае адмаўленне ад лакарнскага дагавору з'яўляецца зусім незаконным, паколькі па ўмовах дагавору ён можа быць разарваны толькі рашэннем большасці Совета Лігі нацый. У сувязі з гэтым чакаюць, што будзе склікана ў бліжэйшы час надзвычайная сесія Совета Лігі нацый.

◆

Намеры французскага ўрада ў сувязі з дэнансаваннем Германіяй лакарнскага пагаднення

ПАРЫЖ, 7 сакавіка. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас паведамляе: «Міністр замежных спраў Фландэн, які павінен быў выехаць сёння раніцай у дэпартамент Іон, застаўся ў Парыжы, каб азнаёміцца з дакладам французскага пасла ў Берліне Понсе аб заявах Гітлера, зробленых раніцай прадстаўнікам дзяржаў, падпісаўшых лакарнскае пагадненне. Як толькі Фландэн азнаёміўся з гэтым дакладам, ён меў гутарку з прэм'ерам Сафо. Ваенны міністр генерал Марэн, міністр без партфеля і прадстаўнік Францыі ў Лізе нацый Банкур, начальнік генеральнага штаба генерал Гамелен і міністр пошты і тэлеграфа Мандэль прынялі ўдзел у гэтай гутарцы.

ПАРЫЖ, 7 сакавіка. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас перадае наступную тэлеграму: «Французскі ўрад прапануе перадаць на разгляд сесіі Совета Лігі нацый, якая збярэцца 10 сакавіка, пытанне аб аднабаковым дэнансаванні з боку Германіі лакарнскага дагавору, а таксама паведаміць Совет Лігі нацый аб мерапрыемствах, якія ўрад прыме ў сувязі з гэтымі дзеяннямі Германіі. З вечара будуць, як відаць, адменены водпускі ва французскай арміі».

◆

Усеагульная забастоўка лодзінскіх тэкстыльшчыкаў

ВАРШАВА, 6 сакавіка. (БЕЛТА). Як паведамляе газета «Кур'ер подзенны», на працягу ўчарашняга дня забастоўка тэкстыльшчыкаў ахапіла ў самай Лодзі 300 фабрык з 24.000 рабочых. У Лодзінскім раёне, згодна падлікаў «Кур'ера цодзеннага», колькасць бастуючых узрасла да 50.000. З прычыны няўступчывасці прадпрыемцаў, з сёнешняга дня абвешчана ўсеагульная забастоўка тэкстыльшчыкаў.

◆

СТАНОВІШЧА Ў ЯПОНІІ

Фармаванне габінета даручана Хірота

ТОКІО, 5 сакавіка. (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Домей Цусін, генро (пажыццёвы дарадца імператара) Сайондзі сёння днём быў зноў прынят імператарам.

Следам за гэтым у палац быў выкліканы міністр замежных спраў Хірота, якому імператар даручыў сфармаваць новы габінет. Даручэнне было дана на аснове рэкамендацыі Сайондзі.

Пазней Хірота заняўся перагаворамі аб сфармаванні новага габінета. Галоўную ролю пасярэдніка ў перагаворах з палітычнымі коламі і ваеннымі ўладамі ад імя Хірот выконвае былы японскі пасол у Рыме Іосіда, якога прочаць у пераемнікі Хірота на пост міністра замежных спраў.

Скупыя прадраканні аб складзе габінета Хірота пакуль абмяжоўваюцца наступнымі кандыдатурамі: міністр замежных спраў — Іосіда, міністр унутраных спраў — цяперашні міністр асветы і лідэр партыі Мінсейто Кавасакі, ваенны міністр — генерал Тэрауці, морскі міністр — адмірал Нагано, міністр гандлю — Маеда.

⁂

ТОКІО, 5 сакавіка. (ТАСС). Агенцтва Домей Цусін паведамляе, што фармаванне габінета Хірота ідзе пакуль без затрымак.

Спыняючыся на акалічнасцях, якія прывялі да рэкамендацыі Хірота ў якасці прэм'ера, Домей Цусін піша, што князь Сайондзі (генро) пасля адмаўлення прынца Каноэ, параіўся з адміралам Осумі і ваенным міністрам Кавасіма, у рэзультаце чаго было прызнана, што,

> **«хоць цяперашняя палітычная змена выклікана вельмі незвычайнай прычынай, усё-ж ажыццяўленне карэнных рэформ выклікала-б цяжкія вынікі для розных колаў. Значыць, напажыць спыніцца на ўмераным дзяржаўным дзеячу ў якасці прэм'ера».**

Разам з тым мелася на ўвазе, што Хірота ў якасці новага прэм'ера здолее «ўстанавіць незалежную знешнюю палітыку з мэтай урэгулявання міжнароднага становішча і гарантыі міру на Ўсходзе».

⁂

ТОКІО, 5 сакавіка (ТАСС). Агенцтва Домей Цусін паведамляе, што канчаткова вырашана прызначыць ваенным міністрам урада Хірота генерала Тэрауці.

⁂

ТОКІО, 6 сакавіка. (БЕЛТА). Адбыўшыяся 5 сакавіка нарады членаў вышэйшага ваеннага совета і вярхоўнай тройкі арміі прызналі неабходным паведаміць новаму прэм'еру Хірота, што ваенныя ўлады рэкамендуюць Тэрауці ў якасці ваеннага міністра, калі Хірота прыме наступныя чатыры патрабаванні:

1) Растлумачэнне сапраўднай сутнасці і значэння дзяржаўнага ладу ў Японіі.

2) Стабілізацыя жыцця нацыі.

3) Узмацненне дзяржаўнай абароны, прывядзенне яе ў здавальняючае становішча.

4) Абнаўленне знешняй палітыкі.

Газеты паведамляюць, што Хірота згадзіўся з гэтымі патрабаваннямі.

⁂

ТОКІО, 6 сакавіка. (БЕЛТА). На адбыўшымся сёння пасяджэнні совета міністраў, якое лічыцца апошнім пасяджэннем урада Окада, прынята рашэнне аб звальненні з дзеючай службы ў рэзерв членаў вышэйшага ваеннага совета Аракі, Мадзакі, Хаясі і Абе, а таксама камандуючага квантунскай арміі Мінамі.

Згодна паведамлення газеты «Асахі», пацверджанага агенцтвам «Дамей цусін», совет міністраў назначыў члена вышэйшага ваеннага совета Уеда камандуючым квантунскай арміяй (японская акупацыйная армія ў Манчжурыі) і японскім паслом у Манчжоу-Го замест Мінамі.

Замах на югаслаўскага прэм'ера

ВЕНА, 6 сакавіка (БЕЛТА). Як паведамляюць з Белграда, на пасяджэнні югаслаўскага парламента (скупшчыны) зроблен замах на забойства югаслаўскага прэм'ер-міністра і міністра замежных спраў Стаядыновіча.

Пасяджэнне парламента было адкрыта каля 11 гадзін. На пасяджэнні прысутнічаў у поўным складзе дыпламатычны корпус і члены ўрада. Стаядыновіч выступіў з прамовай аб знешняй палітыцы Югаславіі. У часе прамовы Стаядыновіч дэпутат апазіцыйнай парламенцкай групы, кіруемай былым прэм'ерам Ефцічам, Арнантовіч выхапіў рэвальвер і зрабіў тры стрэлы, цэлячыся ў Стаядыновіча. Як паведамляюць, Стаядыновіч не пашкоджан.

◆

Італія пагражае выхадам з Лігі нацый

ЛОНДАН, 6 сакавіка. (БЕЛТА). Учора адбылося спецыяльнае пасяджэнне англійскага габінета міністраў, на якім быў заслухан даклад міністра замежных спраў Ідэна. Газета «Таймс» указвае, што пасля даклада Ідэна ў членаў габінета не засталося сумненняў у тым, што Італія ў выпадку прымянення эмбарго на нафту адкажа:

1. Выхадам з Лігі нацый.
2. Адмаўленнем ад лакарнскага дагавору.
3. Скасаваннем франка-італьянскага ваеннага пагаднення і ўстанаўленнем ранейшай колькасці італьянскіх войск на італа-французскай граніцы.

Габінет адобрыў спосаб дзеянняў Ідэна, які згадзіўся са зваротам «камітата 18» да Італіі і Абісініі, маючы на ўвазе, што работы «камітэта 18» (па нафтавых санкцыях) у той-жа час не павінны быць прарваны.

◆

ПЕРАД АБГАВАРЭННЕМ ФРАНКА-СОВЕЦКАГА ДАГАВОРУ ВА ФРАНЦУЗСКІМ СЕНАЦЕ

ПАЧАТАК СПРЭЧАК —12 САКАВІКА

ПАРЫЖ, 6 сакавіка. Пад старшынствам сенатара Беранжэ адбылося пасяджэнне камісіі па замежных справах сената, прысвечанае франка-совецкаму дагавору. На пасяджэнні з вялікай прамовай выступіў прэм'ер-міністр Саро, які матываваў прапанову ўрада аб тэрміновай ратыфікацыі дагавору да роспуску сената на вялікодныя канікулы.

Пасля спрэчак камісія большасцю 19 галасоў супроць 4 пры 4 устрымаўшыхся выказалася за ратыфікацыю франка-совецкага дагавору. У ліку выказаўшыхся за неабходнасць ратыфікацыі знаходзіцца Лаваль.

Згодна рашэння камісіі, абмеркаванне дагавору пачнецца ў сенаце 12 сакавіка. Дакладчыкам вылучан дэ Трокер.

ВЫДАННЕ ГУТАРКІ ТАВАРЫША СТАЛІНА З ГОВАРДАМ

Белпартвыдавецтва выдае на беларускай мове гутарку таварыша Сталіна з старшынёй амерыканскага газетнага аб'яднання Говардам. Брашура выйдзе гэтымі днямі 30-тысячным тыражом.

(БЕЛТА).

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ Ў ДАКУМЕНТАХ

Брыгада навуковых работнікаў інстытута гісторыі Беларускай Акадэміі Навук пад кіраўніцтвам акадэміка Шчарбакова закончыла капітальную працу «Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах» у двух тамах. Першы том аб'ёмам у 40 друкаваных аркушаў выйдзе з друку ў красавіку. Ён ахопіць перыяд з старажытных часоў да канца XVIII стагоддзя. Упершыню публікуецца рад арыгінальных дакументаў і матэрыялаў па гісторыі Беларусі з Літоўскай метрыкі, а таксама знойдзеных у архівах Масквы, Ленінграда, Кіева, Днепрапетроўска і БССР. Другі том выйдзе да XIX галавіны Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі і ахопіць час з XVIII стагоддзя да 1917 года.

ПАМЯЦІ ТАРАСА ШЭЎЧЭНКА

10 сакавіка спаўняецца 75-годдзе з дня смерці вялікага ўкраінскага паэта-рэвалюцыянера Тараса Шэўчэнка. У Беларускай дзяржаўнай бібліятэцы імя Леніна адкрываецца выстаўка твораў паэта.

Народны паэт рэспублікі Янка Купала ў канцы бягучага года або ў пачатку будучага года закончыць поўны пераклад з украінскай мовы на беларускую «Кабзара» Шэўчэнка. Ім перакладзена ўжо каля 5.000 радкоў.

Дзяржаўнае Выдавецтва БССР уключыла ў выдавецкі план на 1936 год выданне на беларускай мове зборніка выбраных твораў Тараса Шэўчэнка.

ВЫЛУЧЭННЕ РАБОТНІЦ

Да міжнароднага комуністычнага жаночага дня 8 сакавіка на менскім клінкерным заводзе работніца тав. Дылевіч вылучана на работу ля складаных машын (4 разрад), работніца Дубіна пераведзена на работу рэзчыцы цэглы. Рад стаханавак цагельных заводаў прэміраваны (сёстры Васільевы з завода № 3 і інш.).

Газетныя радкі

ГУКАВОЕ КІНО Ў КАЛГАСЕ

У калгасе «Перамога», Быстрыцкага сельсовета (Слуцкі раён), заканчваецца абсталяванне калгаснай электрастанцыі. Таксама робіцца ўстаноўка гукавога кіно. (**«Праўда на рубяжы»**).

ДОМ СЕЛЬСОВЕТА

У Круцікаўскім сельсовеце, Расонскага раёна, закончана пабудова новага дома для сельсовета. У доме тры пакоі для совета, чытальня і зала, разлічаная на 200 чал. (**«Калектывіст Расоншчыны»**).

Слесар механічнага цэха № 1 Уралмашзавода (г. Свердлоўск) стаханаўка-комсамолка Марыя Феафанц'еўна КАТЛОВА выконвае норму на 400—500 проц.

НА ЗДЫМКУ: тав. М. Ф. Катлова за ачысткай заўсеніц на шасцярні.

Фото Самойлава (Саюзфото).

ЦІКАВЫ ВОПЫТ ЖЛОБІНСКАГА ПТУШНІЦКАГА СОЎГАСА

Жлобінскі птушніцкі соўгас правёў цікавыя вопыты па атрыманню яек качак у найбольш ранні тэрмін — у студзені, замест сакавіка шляхам узмацнення электраасвятлення на выгулах і ў птушніках. Вопыт поўнасцю сябе апраўдаў. Рэзка павялічылася і яйканоснасць. 514 качак-нясушак, якія знаходзіліся ў зоне ўзмоцненага электраасвятлення, далі ўжо ў студзені 5.000 яек, у той час, як такая-ж колькасць качак, размешчаных у звычайных умовах, далі толькі 519 яек. У вопытную групу былі ўзяты малодкі вываду 1935 г. без адбору.

Апрача таго, у лютым зроблена пробная закладка яек у інкубатары. Гэтымі днямі чакаецца першы вывад маладых качак. У бягучым годзе жлобінскі птушніцкі соўгас здасць дзяржаве 61 тону мяса і 145 тысяч яек.

ПЕРШАЯ ЛЕКЦЫЯ Ў СТАХАНАЎСКІМ УНІВЕРСІТЭЦЕ

6 сакавіка ў Цэнтральным доме тэхнікі адбылася першая лекцыя для слухачоў стаханаўскага універсітэта выхаднога дня. Лекцыю аб ролі Леніна і Сталіна ў барацьбе за рэвалюцыйную тэорыю пролетарыята прачытаў прэзідэнт Акадэміі Навук БССР тав. **Сурта**.

Слухачамі універсітэта з'яўляюцца 400 стаханаўцаў менскіх прадпрыемстваў і 50 членаў іх сем'яў.

НЕБЫВАЛЫ ЎЛОЎ РЫБЫ

Жэрынская рыбная арцель з 14 чал. нядаўна за пяць дзён вылавіла на возеры Жэрына, Чашніцкага раёна, 365 цэнтнераў рыбы — буйнай шчукі, платвы і вокуня. Гэта небывалы ў Беларусі ўлоў за такі кароткі тэрмін. Кіраваў работай старшыня арцелі тав. Панкоў. Лавілі круглыя суткі. Кожны рыбак за гэту пяцідзёнку зарабіў да 1.300 руб. Рыба адпраўлялася на бліжэйшую чыгуначную станцыю Вятна абозамі ў 25 і больш фурманак.

ТЭРМІНОВАЯ МЕДЫЦЫНСКАЯ ДАПАМОГА НА САМАЛЁЦЕ

4 сакавіка было атрымана паведамленне аб цяжкім становішчы хворага пагранічніка ў м. Тураве. Не гледзячы на цяжкія ўмовы пад'ёму самалёта на калёсах на менскім аэрадроме, дзе яшчэ ляжыць снег, і пасадкі ў Тураве, дзе няма снегу, пералёт быў добра праведзен камандзірам санітарнай авіяцыі «Чырвонага крыжа» тав. Ніканавым. Хворы, дзякуючы своечасова аказанай доктарам Лапідусам кваліфікаванай медыцынскай дапамозе, быў выратаван.

БРУК.

«МЫ З КРАНШТАТА»

У другой палове сакавіка Белдзяржкіно атрымае новы гукавы мастацкі фільм «Мы з Кранштата». Гэты фільм, як раней «Чапаеў», выклікае выключную цікавасць з боку працоўных Совецкай Беларусі. У Белдзяржкіно паступаюць дзесяткі пісем і запытанняў з гарадоў і раёнаў рэспублікі аб тым, калі з'явіцца на экранах кінотэатраў БССР гэты выдатны фільм. (БЕЛТА).

УСЕБЕЛАРУСКІЯ ЦЯЖКА-АТЛЕТЫЧНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ

ГОМЕЛЬ, 7 сакавіка (БЕЛТА). 5 і 6 сакавіка ў Гомелі праходзілі ўсебеларускія спаборніцтвы па барацьбе і штанзе, у якіх прымала ўдзел 8 калектываў рэспублікі. Першае месца па барацьбе і штанзе заняў калектыў Менска. Другое месца па барацьбе засталося за Магілевам, а па штанзе за Бабруйскам. Паасобныя ўдзельнікі спаборніцтва занялі першынства ў парадку вагавых катэгорый: па барацьбе — браты Іоселевічы, Майзельс, Мірскі, Куштэйка (Менск), Катовіч (Віцебск), Чуліцкі і Радзевіч (Магілеў); па штанзе—Тайц, Башкіраў, Грыгаровіч, Коган (Менск), Наумаў і Мілееў (Віцебск).

ЛЕДАХОД НА ПРЫПЯЦІ

МОЗЫР, 7 сакавіка. (**Кар. «Звязды»**). 5 сакавіка тэмпература паветра на Палессі дасягнула днём 14 градусаў цяпла. У гэты-ж дзень рака Прыпяць пачала ўскрывацца, трэці дзень ідзе ледаход. На выплаўных канавах пачаўся молевы сплаў.

СХОД УРАЧОЎ МЕНСКА

5 сакавіка ў клубе медсанпрацы адбыўся агульны сход урачоў Менска, прысвечаны барацьбе з грыпознымі захворваннямі. Даклад аб грыпе і метадах барацьбы з ім зрабіў праф. Мелкіх. Ён даў рад указанняў урачам, як патрэбна змагацца з грыпам. Выступіўшы намеснік наркома аховы здароўя т. Нейштадт спыніўся на практычных пытаннях арганізацыі медыцынскай дапамогі хворым на грып. У спрэчках выступілі прафесары Трусевіч і Мац, т. Духан і іншыя.

У канцы схода з вялікай прамовай выступіў нарком аховы здароўя БССР тав. **Бурачэўскі**.

«СПРАВА ЗАБОЙЦАЎ ТЭЛЕФАНІСТКІ ПАНЬКОВАЙ» *)

Выязная судовая калегія Вярхоўнага суда БССР 2—3 сакавіка ў Шклове разгледзела справу забойцаў тэлефаністкі Паньковай. Д. Н. Кізляеў прыгаворан да вышэйшай меры пакарання — расстрэлу, В. І. Кайданаў — да пазбаўлення волі ў аддаленых мясцовасцях СССР, тэрмінам на 10 год. Бацька Кізляева — Н. Ц. Кізляеў прыгаворан да 4 год пазбаўлення волі ў аддаленых мясцовасцях СССР, Е. М. Кізляева — да пазбаўлення волі на 5 год умоўна.

---

*) Гл. «Звязду» ад 29 лютага г. г.

Адказны рэдактар **Н. СТЭРНІН.**

Гукавы кінотэатр „Чырвоная Зорка“. *Ад 8 сакавіка*

НОВЫЙ ЗВУКОВ. ХУДОЖЕСТВ. ФИЛЬМ

ДУБРОВСКИЙ

ПО А. ПУШКИНУ

Вытворчасць **Ленінградскай ордэна Леніна кіно-студыі „Ленфільм“.**

Рэжысер **А. Іваноўскі.**

У галоўных ролях: народныя арт. рэспублікі **В. Р. ГАРДЗІН М. М ТАРХАНАЎ;** засл. арт. рэспублікі **Н. Ф. Манахаў Б. НЛіванаў,** арт. **Галіна Грыгор'ева.**

ШТОДЗЕННА 4 СЕАНСЫ. Пачатак у 6, 7-30, 9-15 і 11 гадзін вечара.

Першы Беларускі дзяржаўны тэатр БДТ-1

8 сакавіка

ПЛАТОН КРЭЧЭТ

Пачатак у 8 г. веч.

Білеты—у касе тэатра.

Гукавы кінотэатр „ПРОЛЕТАРЫЙ“ — Мастацкі гукавы фільм „ПА СЛЯДАХ ГЕРОЯ“

Гукавы кінотэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» — Гукавы замежны фільм ПАД ДАХАМІ ПАРЫЖА

Кіно «СПАРТАК» — Выдатны ўсходні фільм НАМУС (Честь)

ПАТРЭБНЫ

прыбіральшчыцы і афіцыянтка.

Зварачацца: Совецкая, 63, 2-гі паверх, выдавецтва „Звязды“.

ПРЫ ЗНЯСІЛЕННІ НЕРВОВАЙ СІСТЭМЫ

ПРЫМЯНЯЕЦЦА

ЛЕЦИТОГЕМОЛЬ

(Лецытын і гемаглабін ў таблетках).

Спосаб карыстання: па 2—4 таблеткі 2—3 разы ў дзень за гадзіну да яды.

ПРОДАЖ ва ўсіх аптэках і магазінах сантігіены СССР.

Пры адсутнасці на мясцах высылаецца поштай галоўным складам інстытута па атрыманні задатку не менш аднаго рубля з кожнай каробкі.

АДРАС: Харьков, ул. Артема, № 12. Укр. институт эндокринологии.

НУМАРЫ ТЭЛЕФОНАЎ РЭДАКЦЫІ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

1. Габінет адказнага рэдактара — 21-352
2. Нам. адказнага рэдактара — 25-188
3. Сакратарыят — 20-830
4. Прамысловы аддзел — 21-356
5. Аддзелы: мясцовай і замежнай інфармацыі — 25-189
6. Аддзел партыйнага будаўніцтва — 21-353
7. Сельскагаспадарчы аддзел — 21-846
8. Аддзел асветы, літаратуры і мастацтва — 23-955
9. Аддзел агляду друку — 22-412
10. Аддзел пісем рабочых і калгаснікаў — 21-399
11. Спецаддзел — 23-966
12. Машыннае бюро, прыём інфармацыі — 21-351
13. Заг. выдавецтва — 21-358
14. Бухгалтэрыя — 21-845
15. Масава-тыражны — 21-360

У аптэках і санітарных магазінах БЕЛАПТЭКАКІРАЎНІЦТВА

АДПУСКАЮЦЦА

па ручному продажу (без рэцэптаў)

НАСТУПНЫЯ ПРАДМЕТЫ:

1. Аспірын
2. Борная кіслата
3. Папера кампрэсная
4. Гліцэрын
5. Гарчычнікі
6. Іёдная настойка
7. Калодзій
8. Кроплі нашатырна-анісавыя
9. Кроплі мятныя
10. Кроплі валер'янавыя
11. Кроплі зубныя
12. Кроплі Дацкага караля
13. Касторавае масла
14. Касторавае масла ў капсулях
15. Маліна сушаная
16. Масла канфоравае
17. Мазь Вількінсона, іхтыолавая, ртутная, цынкавая і сулемовая
18. Мятныя ляпёшкі
19. Нафталін
20. Нашатырны спірт
21. Пертусін
22. Піўныя дрожджы
23. Парашкі ад галаўной болі
24. Пурген
25. Рамашка
26. Рыбны тлушч
27. Шкіпінар
28. Салол
29. Саліцылавы натр
30. Спірт мыльны
31. Соль англійская
32. Сантанінавыя таблеткі
33. Сахарын
34. Секараўская вадкасць
35. Тэрмометры
36. Тальк
37. Фенацэцін
38. Фіцін
39. Цытварнае семя
40. Чарніка сушоная
41. Шалфей
42. Банкі крывеадсосныя
43. Вата, бінты
44. Кружкі Эсмарха

Таксама ёсць рад іншых медыкаментаў, прадметаў догляду хворых і сангігіены, а таксама і мінеральныя воды.

БЕЛАПТЭКАКІРАЎНІЦТВА.

Інстытут масавага завочнага навучання партактыва ПРЫ ЦК КП(б)Б

8 і 9 сакавіка г. г. праз менскую радыёстанцыю ў 19 г. 30 м. **слухайце радыёлекцыі т. Ем. ЯРАСЛАЎСКАГА.**

8 сакавіка — **Як будуецца партыя большэвікоў.**

9 сакавіка — **Статут ВКП(б) аб абавязках членаў партыі.**

Дырэктар ІМЗО пры ЦК КП(б)Б БЕКЕРМАН.

ЦК Чырвонага Крыжа БССР

ПАТРЭБЕН

для работы ў апараце

ГАЛОЎНЫ БУХГАЛТАР.

Аплата па згодзе.

Зварачацца: Комуністычная, 2.

Тэл. 21-608.

Жылземкіраўніцтву

ПАТРЭБЕН

ГАЛОЎНЫ БУХГАЛТАР.

Аплата па згодзе.

Зварачацца: Пляц Волі, 2.

Тэл. 23-115.

Тыраж 95055 экз.

Друкарня газеты «Звязда» Менск, Совецкая, 63.

Уп. Галоўлітбела № К—55.